WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 СТУДЗЕНЯ 2012 г. АЎТОРАК
№ 4 (27119)
Кошт 800 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.



Фота БЕЛТА.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАВЕДАЎ ДОМ МІЛАСЭРНАСЦІ І СУСТРЭЎСЯ З МІТРАПАЛІТАМ ФІЛАРЭТАМ

**У святое свята Раства Хрыстовага 7 студзеня кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка пабываў у Доме міласэрнасці і сустрэўся з Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Па існуючай ужо традыцыі Прэзідэнт наведаў праваслаўны храм і запаліў калядную свечку.

Аляксандр Лукашэнка і Мітрапаліт Філарэт абмяняліся падарункамі. Прэзідэнт перадаў у дар унікальны экзэмпляр Евангелля. Кніга выканана ў старадаўніх літургічных традыцыях і прызначана для выкарыстання ў час богаслужэння. Тэкст аддрукаваны на царкоўнаславянскай мове. Верхняя і ніжняя вокладкі ўпрыгожаны багатым акладам з чаканкі з выявамі Ісуса Хрыста і чатырох евангелістаў. Гэты падарунак прызначаны для асабістай бібліятэкі Мітрапаліта Філарэта, які збірае рэдкія і ўнікальныя кнігі.

Затым Аляксандр Лукашэнка і Уладыка Філарэт у цёплай неафармальнай абстаноўцы пагутарылі аб духоўным адраджэнні грамадства, аб узаемадзеянні дзяржавы і Беларускай праваслаўнай царквы, аб развіцці хрысціянскай цывілізацыі ў сучасным свеце.

## ХТО ЦЯПЕР МАЕ ПРАВА НА ЛЬГОТНЫ КРЭДЫТ?

**Указ № 13 «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў» 6 студзеня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 2

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АДВЁЎ ГОД НА ВЫБУДОЎВАННЕ РАБОТЫ СЛЕДЧАГА КАМІТЭТА

**Следчы камітэт на працягу 2012 года павінен дакладна выбудаваць сваю работу і стаць паўнацэнный дзеючай структурай. Такую задачу паставіў 9 студзеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам старшыню Следчага камітэта Валерыя Вакульчыка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што праз год структура Следчага камітэта павінна быць цалкам адшліфавана з улікам тых недахопаў, якія будуць выяўлены ў працэсе яго работы. Акрамя таго, неабходна будзе канчаткова вызначыцца і з кадравым складам гэтай структуры. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Следчы камітэт павінен стаць узорам для ўдасканалення работы іншых сілавых структур.

З пачатку года супрацоўнікамі Следчага камітэта ажыццёўлены больш за 3 тыс. выездаў у складзе следча-аператыўных груп, узбуджана 1122 крымінальныя справы, па якіх пачата вядзенне следчымі камітэта. Як адзначыў Валерый Вакульчык, супрацоўнікі Следчага камітэта разам з органамі МУС расследуюць злачынствы, своечасова раскрываюць па выніках і паведамленні аб здарэннях і злачынствах.

У той жа час у стадыі вырашэння знаходзіцца яшчэ шэраг гаспадарчых, бытавых пытанняў, у тым ліку па размяшчэнні падраздзяленняў Следчага камітэта ў абласных і раённых цэнтрах. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ў арганізацыі работы Следчага камітэта павінны прымаць удзел кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных спраў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі, а таксама губернатары. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пры правядзенні рабочых паездак па рэгіёнах краіны ён мае намер наведваць аб'екты Следчага камітэта.

## ПРЭЗІДЭНТ ПАТРАБУЕ КОМПЛЕКСНАГА РАЗВІЦЦЯ ГОРАДА МІНСКА

**Горад Мінск павінен развівацца комплексна. Гэтага запатрабаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 студзеня ў час рабочай сустрэчы са старшынёй Мінгарвыканкама Мікалаем Ладуцькам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

У сталіцы нараўне з жылымі аб'ектамі павінны адначасова ўзводзіцца дзіцячыя сады, школы, аб'екты гандлю, а таксама бытавога абслугоўвання і спорту. У прыватнасці, пастаўлена задача пачаць будаўніцтва ў горадзе новых фізкультурна-аздараўленчых комплексаў. У кожны год такі аб'ект пачнуць узводзіць у Заводскім раёне сталіцы, такія комплексы таксама будуць пабудаваны і ў іншых раёнах.

Паводле слоў Мікалая Ладуцькі, у Мінску ў мінулым годзе пабудаваны 1 млн кв.м жылля. Такую ж колькасць плануецца ўзвесці ў сталіцы ў 2012 годзе.

Кіраўнік дзяржавы далажана аб перспектывах развіцця і рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у Мінску.

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што сталіца Беларусі павінна мець высокую інвестыцыйную прывабнасць, і для гэтага на дзяржаўным узроўні створаны усе неабходныя ўмовы. Цяпер усё залежыць ад дзейнасці мясцовай улады.

Прэзідэнт адзначыў нейкую дынаміку ў рэалізацыі шэрагу інвестыцыйных праектаў па забудове Мінска. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў паскорыць ажыццяўленне інвестпраектаў у жылым комплексе «Усходні мжа Мінска», дзелавым цэнтры «Мінск-Сіці», на праспекце Пераможцаў, у раёне Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарогі.

Мэр горада адзначыў, што ў адпаведнасці з даручэннямі Прэзідэнта ёсць канкрэтны план развіцця сталіцы, і гарадскія ўлады гатовы да супрацоўніцтва па яго рэалізацыі ў першую чаргу з айчынным бізнесам, а таксама з замежнымі кампаніямі.

Пачынаючы з чацвёртага квартала мінулага года назіраецца павелічэнне інвестыцыйнай актыўнасці з боку замежных прадпрыемстваў, кампаній, прыватных інвестараў. Напрыклад, за тры апошнія месяцы мінулага года заключана больш за 10 інвестыцыйных дагавораў, якія пачнуць практычна рэалізоўвацца ў Мінску ў першым паўгоддзі 2012 года.

Асаблівую ўвагу Прэзідэнт звярнуў на якасць работы будаўнічага комплексу сталіцы. Пакуль гэта сфера істотна адстае па ўзроўні прадукцыйнасці працы ў параўнанні з заходнееўрапейскімі меркамі. У сувязі з гэтым Мікалай Ладуцька паабяцаў, што ў 2012 годзе па гэтым паказчыку будаўнікі выйдуць на больш высокі ўзровень. Рэзервы — у паляпшэнні арганізацыі працы на будаўнічых пляцоўках, у прымяненні новых сучасных тэхналогій, а таксама павышэнні адказнасці і ўзмацненні працоўнай дысцыпліны.

# КАЛЯДНЫ ГАРБУЗ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхары вёскі Раздзялавічы Ганцавіцкага раёна ў святыя вечары трымаюцца даўняй традыцыі калядаваць з гарбузом і свячою.

## АБ'ЁМ ЗОЛАТАВАЛЮТНЫХ РЭЗЕРВАЎ БЕЛАРУСІ ДАСЯГНУЎ ГІСТАРЫЧНАГА МАКСІМУМУ

**Аб гэтым паведамляе ўпраўленне інфармацыі Нацыянальнага банка. Па папярэдніх звестках, на 1 студзеня 2012 года аб'ём золатавалютных рэзерваў краіны ў вызначэнні Спецыяльнага стандарту распаўсюджвання звестак МВФ склаў 7,9159 млрд долараў ЗША ў эквіваленце. У нацыянальным вызначэнні — 9,3872 млрд долараў ЗША.**



Атрымліваецца, што за 2011 год рэзервы ў міжнародным вызначэнні павялічыліся на 2,8852 млрд долараў альбо больш чым на 57 працэнтаў. У выніку — паказчык рэзервовых актываў перавысіў прагнознае значэнне ў 6,2307 млрд долараў. У снежні мінулага года рэзервы павялічыліся праз атрыманне другога траншу крэдыту Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС (440 млн долараў) і залічэнне ў склад рэзерваў часткі сіндыцыраваннага крэдыту Ашчадбанка Расійскай Федэрацыі і Еўразійскага банка развіцця, які быў выдадзены ААТ «Беларуськалій».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## НАБЫЦЬ БІЛЕТЫ СТАЛА ПРАСЦЕЙ

**Пашырана сетка продажу праязных дакументаў на пасажырскія цягнікі, якія курсіруюць ва ўнутрырэспубліканскіх і міжнародных зносінах.**

Як распавялі ва УП «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі», у межах Мінска праязныя дакументы цяпер можна набыць на станцыях Мінск-Пасажырскі (Прывакзальная плошча, 3, вуліца Бабруйская, 4, вуліца Вараянскага, 6), Мінск-Усходні, Мінск-Паўднёвы, Сцяпянка, Ждановічы, на прыпыначных пунктах Лебядзіны, Масюкоўшчына.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надзённае

## КОНКУРСНЫ АДБОР У ГІМНАЗІІ ЎДАСКАНАЛЬВАЕЦЦА

**НА забеспячэнне сацыяльнай справядлівасці і адбор найбольш таленавітых і здольных дзяцей скіраваны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 15 «Аб некаторых пытаннях прыёму асобаў у гімназіі, гімназіі-інтэрнаты, гімназіі-каледжы мастацтваў», які кіраўнік дзяржавы падпісаў 6 студзеня.**

У прыватнасці, гэтым дакументам замацоўваецца парадак прыёму ў гімназіі на падставе ўступных выпрабаванняў па прадметах «Беларуская мова», «Руская мова» і «Матэматыка» і гадавых адзнак за IV клас па тых жа прадметах, а ў гімназіі-каледжы мастацтваў — таксама па выніках праверкі здольнасцяў дзяцей у галіне асобных відаў мастацтваў.

Як патлумачылі журналісту «Звязды» ў галоўным адукацыйным ведамстве краіны, раней залічэнне ў гімназіі ажыццяўлялася толькі па выніках экзаменацыйных адзнак, але з 2011 года пад улік сталі брацца і гадавыя адзнакі дзіцяці па экзаменацыйных дысцыплінах. У Міністэрстве адукацыі ўпэўнены, што залічэнне ў гімназію з улікам гадавых адзнак узмацняе ўвагу да ўсяго адукацыйнага працэсу, а не толькі да ўступных выпрабаванняў, да таго ж чым большая колькасць адзнак бярэцца пад увагу, тым меншая верагоднасць у прэтэндэнтаў на званне гімназіста набраць аднолькавую колькасць балаў. Цяпер максімальная сума балаў, якую можа набраць вучань пры паступленні, складае 60. Для прыкладу, у сталіцы летась сярэдні бал залічаных у гімназіі быў 46,3 бала з 60 магчымых. У некаторых гімназіях конкурс быў два прэтэндэнты на месца, а сярэдні конкурс у мінскія гімназіі склаў 1,6 чалавека на месца.

Усяго ў Беларусі функцыянуе ў бягучым навучальным годзе 212 гімназій, што складае 6% ад агульнай колькасці агульнаадукацыйных устаноў: 24 гімназіі — у Брэсцкай вобласці, 25 гімназій — у Віцебскай, 31 — у Гомельскай, 35 — у Гродзенскай, 36 — у Мінскай, 20 — у Магілёўскай і 41 — у Мінску.

Па словах намесніка міністра адукацыі Казіміра Фарыно, эфектыўнасць дзейнасці гімназій пацвярджаецца многімі крытэрыямі. Скажам, сярод пераможцаў заключнага этапу леташняй рэспубліканскай алімпіяды па агульнаадукацыйных дысцыплінах гімназісты склалі 47 працэнтаў ад агульнай колькасці яго ўдзельнікаў. Па выніках цэнтралізаванага тэсціравання сярэдні бал удзельнікаў гімназій на 13 балаў вышэйшы за сярэдні бал навучэнцаў сярэдніх школ. Гімназісты складаюць таксама большую палову ўдзельнікаў рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцый па ўсіх вучэбных прадметах. У той жа час без правядзення якаснага адбору для навучання ў гімназіі дасягненне такіх высокіх вынікаў наўрад ці было б магчымым.

Зацвярджэнне парадку адбору прэтэндэнтаў на атрыманне гімназічнай адукацыі Указам кіраўніка дзяржавы з'яўляецца сведчаннем таго, якая сур'ёзная ўвага надаецца гэтаму пытанню. Варта нагадаць, што Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зацвярджаюцца таксама Правілы прыёму ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы...

Трэба таксама дадаць, што згодна з Указам Прэзідэнта, пераважнае права на залічэнне ў гімназіі і гімназіі-інтэрнаты пры роўнай колькасці балаў будуць мець асобы з больш высокім сярэднім балам вынікаў атэстацыі за год навучання, які папярэднічаў году прыёму, а ў гімназіях-каледжах мастацтваў перавагай будуць карыстацца дзеці, якія прадэманструюць на ўступных экзаменах больш высокі ўзровень здольнасцяў у асобных відах мастацтваў.

Па-за конкурсам пры ўмове атрымання на ўступных іспытах адзнак не ніжэй як 6 балаў у гімназіі-інтэрнаты будуць залічвацца ў парадку пераліčэння: дзеці-сіроты і дзеці, што засталіся без бацькоўскай апекі, дзеці са шматдзетных сем'яў, а таксама дзеці, што пражываюць у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва менш як 20 тысяч чалавек.

У тым выпадку, калі пасля заканчэння 9-ці класаў навучэнцы гімназіі пажадаюць прадоўжыць свае навучанне ў гімназіі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, яны змогуць гэта зрабіць без дадатковай здачы ўступных іспытаў і праверкі іх здольнасцяў у асобных відах мастацтваў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

## У чацвер пацяплее да плюс 7, пойдзе мокры снег з дажджом

**Сёння ўдзень наша краіна застанецца пад уплывам зоны паніжанага атмасфернага ціску, таму ў асобных раёнах невялікі снег, месцамі слабы туман, намаразь і галалёд, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Тэмпература паветра ўдзень ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. Уначы на сераду ў асобных раёнах магчымы невялікі снег, а ўдзень снег пачне чаргавацца з мокрым снегам, на захадзе краіны — ужо з дажджом. Галалёд, на дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад 0 да мінус 7, пры праясненнях да 10 марозу, удзень — ад мінус 4 на ўсходзе да плюс 4 градусаў на захадзе Беларусі.

Самы цёплы дзень тыдня чакаецца 12 студзеня. Ужо паўсюдна будзе ісці мокры снег з дажджом. Уначы і раніцай месцамі галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер заходні парывісты. Уначы ад мінус 4 да плюс 4, удзень — 0 — плюс 5 градусаў, на захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей — да 7 цяпла.

Напрыканцы тыдня зноў пахаладае. Усё часцей будзе ісці мокры снег, а не дождж. Усталюецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ў пятніцу на працягу сутак ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. У суботу стане яшчэ халадней, часам чакаецца снег і слабая мяцеліца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ПЕРШАЯ АХВЯРА ТОНКАГА ЛЁДУ...

**Першая з пачатку года трагедыя на вадаёме адбылася ў Браслаўскім раёне.**

Як паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, пасля 11 гадзін ад відавочцы выратавальнікі атрымалі паведамленне: каля вёскі Баруны на возеры Заборна тоне чалавек. Калі на месца здарэння прыбылі першыя падраздзяленні МНС, высветлілася, што на вадаёме знаходзіліся тры чалавекі. Два патанулі, трэцяга выратавалі відавочцы. Брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі з дыягназам «агульнае пераахаладжэнне» мужчына быў шпіталізаваны ў Браслаўскую цэнтральную раённую бальніцу. Целы тапельцаў дасталі работнікі Браслаўскага АСВОДа. Абставіны здарэння высвятляюцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Гонар нацыі

## МІСІЯ — ПОМНІЦЬ!

**ГЭТЫМ фільмам па праве ганарацца людзі, якія яго стваралі. Сёння ён прызнаны на вышэйшым узроўні. За шматсерыйны дакументальны фільм «Гарады-героі» калектыў аўтараў ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» удастоены прэміі «За духоўнае адраджэнне». Фільм складаецца з 13 серый, кожная з якіх — асобная гісторыя-трагедыя горада, а разам яны — аповед аб вайне, жаху, а таксама аб подзвігу, годнасці і гонары.**

У гарадах-героях сабраны ўспаміны сведкаў тых гадоў. Калі вяліся здымкі фільма, слёзы былі на вачах не толькі тых, хто распавядаў пра вайну, але і тых, хто гэта здымаў...

Ужо больш за год мінула з прэзентацыі гэтага фільма, а лісты з падзякай ад ветэранаў на адрас АНТ ідуць амаль кожны тыдзень.

Але чаму за здымкі фільма пра гарады-героі ўзялася менавіта Беларусь, на яе ж тэрыторыі толькі горад-герой Мінск і Брэсцкая крэпасць—герой, астатнія здымачныя пункты — на тэрыторыі Расіі і Украіны? З такім пытаннем звяртаюся да генеральнага прадзюсара праекта, намесніка старшыні праўлення АНТ Аляксандра Рыдвана.



СТАР. 3

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ПАСАЖЫРСКІ ЦЯГНІК З РЫГІ Ў МІНСК ПРЫБЫЎ СА СПАЗНЕННЕМ БОЛЬШ ЯК НА 5 ГАДЗІН

**Пасажырскі цягнік з Рыгі ў Мінск прыбыў учора са спазненнем больш як на 5 гадзін, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Беларускай чыгункі.**

«Цягнік № 388 Рыга—Мінск прыбыў у сталіцу са спазненнем на 5 гадзін 21 хвіліну», — праінфармавалі ў прэс-службе. Затрымка цягніка выклікана сходам 17 грузавых вагонаў-цыстэрнаў на тэрыторыі Латвіі (401 км станцыі Крауя Латвійскай чыгункі), які здарыўся 8 студзеня ў 23 гадзіны 14 хвілін па беларускім часе. Вагонаў Беларускай чыгункі сярод сышоўшых не было.

Для аказання дапамогі па ліквідацыі наступстваў сходу вагонаў у Латвію накіраваны аднаўленчы цягнік станцыі Полацк Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі.

### НАЧНАЯ ПАГОНЯ Ў СТАЛІЦЫ СА СТРАЛЯНІНАЙ

**Усё пачалося з таго, што ў 2.20 ночы работнікі АЗС па вуліцы Трасцянецкай у Мінску паведамілі ў міліцыю пра п'янага кіроўцу «БМВ-525», які, заправіўшыся, з'ехаў у бок праспекта Ракасоўскага. Неўзабаве нарады ДАІ ўбачылі гэтае аўто, якое на вялікай хуткасці імчала ў бок скрыжавання Партызанскага праспекта і вуліцы Кашавога. Патрабаванне спыніцца кіроўца праігнараваў. Пачаўся пераслед.**

— У спадарожным кірунку рухалася таксі. Кіроўца апошняга, заўважыўшы маячкі машын ДПС, з'ехаў да ўзбочыны і спыніўся. За ім спыніўся і «БМВ», аднак кіроўца з машыны не выйшаў. З інспектарам ён размаўляў праз адчыненыя дзверы. На патрабаванне выйсці кіроўца «БМВ» уключыў заднюю хуткасць і рвануў з месца. Пры гэтым ледзьве не пацярпеў інспектар, — распавёў падрабязнасці здарэння прэс-афіцэр Ленінскага РАУС Уладзімір Кухарчык.

Калі зноў распачаўся пераслед, інспектары мусілі выкарыстаць табельную зброю. Два папераджальныя стрэлы ў паветра — выніку няма. Давялося прастрэліць заднія колы «БМВ». Аднак кіроўцу гэта не спыніла: на дысках машына ўехала ў двор жылога дома. Толькі тут той кінуўся прэч, але далёка не ўцёк. Дарэчы, потым у яго крыві было зафіксавана 1,22 праміле алкаголю. Дык вось, калі праводзілася затрыманне, кіроўца паводзіў сябе даволі агрэсіўна, аказваў супраціўленне, так што давялося выкарыстоўваць наручнікі. Пакуль вядома толькі тое, што затрыманы — 1992 года нараджэння, паводле яго слоў, пражывае ў сталіцы, нідзе не працуе. Пасведчанне кіроўцы атрымаў крыху больш за год таму, аднак за гэты час ужо двойчы прыцягваўся да адказнасці за парушэнне правіл дарожнага руху.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

УНП 100092167

## ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ ОАО «Центроэнергомонтаж»

| | |
|---|---|
| Фамилия, имя, отчество покупателя (полное наименование для юридического лица) | **Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж»** |
| Место жительства (местонахождение для юридического лица) | **220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7** |
| Наименование и местонахождение эмитента | **Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж», 220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7** |
| Цель приобретения акций | **Сокращение общего количества акций для последующего аннулирования** |
| Количество приобретаемых простых (обыкновенных) акций (штук) | **20 000** |
| Цена приобретения (белорусские рубли) | **70 000** |
| Сроки, форма и порядок расчета | **Оплата производится в течение 30 банковских дней с дня заключения договора купли-продажи. Оплата производится денежными средствами в наличной (безналичной) форме, определенной договорами купли-продажи акций.** |
| Адрес, по которому будут представляться предложения акционеров и заключаться договоры купли-продажи акций | **г. Минск, переулок Велосипедный, д. 7 с пометкой «Совет директоров. Предложение о покупке акций»** |
| Даты начала и окончания представления предложений акционеров на продажу акций | **с 10 января 2012 года до 14 февраля 2012 года** |
| Даты начала и окончания покупки акций | **с 16 февраля 2012 года по 29 февраля 2012 года** |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | Лот № 1. Грузовой автомобиль ЗИЛ 431610, г.н. АВ 6901-2, стоимостью 24 764 000 рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | ЧТУП «ПартнерСервисПлюс» УНП 390494359 |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Витебск, ул. Терешковой, 13А |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Интернет-портал хозяйственных судов Республики Беларусь http://court.by/sales/ С 9 часов 00 минут 01.02.2012 по 18 часов 00 минут 10.02.2012 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 321, http://vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Бураков Игорь Вячеславович, тел./факс (80212) 49 13 45, (8 029) 366 40 15, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 (8044) 746 73 00 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, в течение 15 дней со дня, следующего за днем размещения публичного извещения об электронных торгах на интернет-портале хозяйственных судов Республики Беларусь, обязано пройти регистрацию. Для регистрации на сайте лицо знакомится с порядком проведения торгов, дает подписку об отсутствии препятствий для участия в торгах в соответствии со статьей 384 ХПК, перечисляет задаток в размере 10% от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 25.01.2012 и заполняет заявление. Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС http://court.by/vitebsk/divestiture/, http://court.by/sales/. |

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.01.2012 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 8 470,00 | 1 чэшская крона | 419,60 |
| ▼ 1 еўра | 10 790,00 | 1 польскі злоты | 2 412,25 |
| 1 латвійскі лат | 15 492,96 | 1 расійскі рубель | 261,00 |
| 1 літоўскі літ | 3 132,92 | 1 украінская грыўня | 1 054,14 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 32,1961 |
| 10 UAH | 40,0549 |
| 10000 BYR | 38,5582 |
| EUR | 41,6714 |

# МІСІЯ — ПОМНІЦЬ!



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Беларусь адчувае сваю адказнасць за захаванне памяці пра Вялікую Айчынную вайну. Яна была адной з краін, на якую прыпалі першыя дні вайны. Напэўна, у гісторыі кожнай беларускай сям'і ёсць прыклады пра тых, хто ваяваў, загінуў, пакутаваў. Таму вайна не выходзіць з нашай памяці. Многія могуць са свайго дзяцінства ўзгадаць, што яна, гэтая памяць, была не толькі 9 мая, яна была бесперапыннай. Патрыятычнае выхаванне было вельмі яскравым, насычаным, пастаянна ў школу прыходзілі ветэраны. «Беларусьфільм» у асноўным здымаў фільмы пра вайну, складвалася ўражанне, што наша краіна — спецыяліст па вайне. Яна — як вялікая варонка, якая яшчэ не зарасла. Я не хачу папракаць іншыя краіны, але заўважаецца: чым больш праходзіць гадоў, тым меншай становіцца гэта памяць пра вайну. Часам нас крытыкуюць на Захадзе, і хоць бы хто ўзгадаў там, што мы перажылі. Гэтая гісторыя — на адлегласці выцягнутай рукі. Мой бацька гэтую вайну бачыў на свае вочы. Я вітаюся з ім — і гэта сведка той вайны. Як можна забыць пра гэта еўрапейцам, амерыканцам? Як можна так да нас ставіцца, калі ў вайне мы страцілі трэць сваёй нацыі!

Мы кожны тыдзень атрымліваем якія-небудзь весткі ад нашых калег, сяброў з СНД, ад паслоў Расіі, Украіны, якія адгукаюцца на фільм «Гарады-героі», але ніводнае замежнае пасольства да фільма пра вайну не праявіла цікавасці.

**— Альтэрнатывы фільму «Гарады-героі» няма ў краінах СНД?**

— Вядома, шмат сказана пра вайну, пра гарады-героі, але ўсё гэта — у адрывачных момантах. Абагульнення такога не было. Гэта пацвярджаецца вялікай цікавасцю расійскіх тэлекампаній да нашага праекта. Некалькі вядучых цэнтральных каналаў хочуць набыць у нас выключныя правы на гэты фільм. Прычым, іх задавальвае не толькі змест, але і якасць. Яшчэ шмат жывых сведкаў вайны, і мы вельмі адказна падыходзілі да матэрыялу, да сцэнарыя, імкнуліся не дапусціць памылак, нейкіх перабольшванняў альбо забыцця пэўных гераічных момантаў вайны. І ад ветэранаў мы не чулі ніякіх заўваг. Нас пастаянна запрашаюць прэзентаваць фільм. Увесь час ідуць лісты ад ветэранаў. Пасля першага эфіру мне як прадзюсару нават прыйшоў ліст з удзячнасцю за гэты фільм, у які была ўкладзена насоўка з вышыўкай маіх ініцыялаў.

**— Ствараючы такі праект, ці сталі вы пачынальнікам новага кірунку ў тэлежурналістыцы?**

— Так, гэта абсалютна новы, сінтэтычны фармат — у фільме спалучаюцца і дакументалістыка, і мастацкае пастановачнае кіно, і мультыплікацыя — камп'ютарная графіка. І ўсё гэта працуе на адзін вобраз — вобраз вайны. У тэлебачанні гэта новае слова. Фільм стаў этапам у развіцці як сучаснай дакументалістыкі, так і тэлебачання ў цэлым.

**— У фільме пра Севастопаль ветэран узгадвае пра вайну, як пра «мясарубку», кажа, што ніводзін пісьменнік, ніводзін мастак не здолее перадаць тое, што было. Як вам здаецца, выкарыстоўваючы новыя тэхнічныя сродкі, ці змаглі вы і псіхалагічна падаць вайну па-новаму?**

— Мы не ставілі задачу зачапіць глыбінныя пачуцці ў гледача. У эмацыянальным сэнсе мастацкае кіно ўсё ж больш пранікліваe, і можна ўзгадаць не адзін дзясятак фільмаў, якія бралі за душу і якія немагчыма глядзець без слёз. Перад намі іншая задача стаяла. Калі мы пачалі абмяркоўваць гэты праект і выбіраць сродкі выразнасці, хацелі зрабіць гэты фільм цікавым перш за ўсё моладзі. Сродкі, танальнасць і дынаміка былі скіраваны на ўспрыняцце менавіта маладым пакаленнем. Маладыя людзі хочуць не чуць, а бачыць. Мы хацелі ўсадзіць моладзь перад тэлевізарам. Хроніка для нас была важная толькі як дадатковы мазок, усё ж упор мы рабілі на ўласную рэканструкцыю, уласныя эксперыменты. Калі я глядзеў вайну праз хроніку, я не зусім разумеў, не адчуваў яе. А ў фільме ёсць такія моманты ў стэндапах, напрыклад, калі вуліцы Нямігі ператвараюцца ў гета. Зараз сам сябе часта лаўлю на думцы, калі іду па сучаснай Нямізе, што дзесьці тут знішчалі людзей... Тэма вайны не павінна ніколі знікаць. Гэта як Біблія, як законы маралі. І я ніколі не бачыў, каб наш народ неяк адварочваўся ад гэтай тэмы.

**— Але, напрыклад, у Прыбалтыйскіх краінах сёння некаторыя людзі імкнуцца забыць пра вайну, а разам з тым пра страты, боль, гора...**

— Яны забываюць таму, што ім трэба забыць камунізм, Сталіна і г.д. Але разам з гэтым яны выкідваюць і ўсё іншае. Яны многае губляюць. На чым яны будуць выхоўваць будучае пакаленне, на якіх прыкладах? Гэта важна нават для фарміравання асобы, мужчыны, абаронцы, які будзе адчуваць, што ён прадстаўнік не нейкага абстрактнага народа, а народа, які перамог. Як можна не паважаць пакаленне, якое перажыло вайну?



**— Многія ветэраны кажуць, што вайна да гэтага часу застаецца нявывучанай, у гісторыі шмат белых старонак. Ці адчулі вы гэта, працуючы над фільмам?**

— Яшчэ як! З любым ветэранам пагавары — гэта не тое што гісторыя, цэлы раман. Гісторыя кожнага салдата — гэта і ёсць вайна. Гэта яго погляд на гэту вайну, яго канкрэтны канфлікт з гэтай вайной, гэта яго асабістая вайна з праціўнікам. Хіба гэта не варта падрабязнага разгляду?

**— Ці цяжка здымаць ветэранаў, калі яны пачынаюць узгадваць пра вайну?**

— У гэтых людзей асноўная дзея ў жыцці — вайна. І ўсё на паверхні. Гэта цяжка патлумачыць. Гэта людзі без скуры. Да іх дакранацца трэба асцярожна. Яны вельмі ранімыя. Як толькі пачынаеш гаварыць пра вайну, слёзы — гэта самае малое.

**Да гутаркі далучаецца Алеся ЛІТВІНАВА — выканаўчы прадзюсар праекта:**

— На Беларусі мы здымалі толькі ў Мінску і Брэсцкай крэпасці, а большасць здымак было ў Расіі і ва Украіне. І для жыхароў гэтых краін было самым дзіўным тое, што мы, беларусы, да гэтага часу так памятаем пра вайну, цікавімся, цэнім, паважаем. Слёзы з'яўляліся ў ветэранаў нават толькі таму, што іх паклікалі. У Маскве, напрыклад, была такая сітуацыя, калі Саюз ветэранаў напачатку адмовіўся нам дапамагаць у арганізацыі інтэрв'ю. Нам казалі, што не вераць, таму што пад выглядам тэлевізійнікаў прыходзяць зладзеі і рабуюць ветэранаў. Давялося прыкласці шмат намаганняў, каб людзі зразумелі, што мы прыехалі з добрай місіяй: распавесці пра тое, якім коштам давалася перамога, што мы не збіраемся па-іншаму ацаніць гісторыю, перавярнуць яе з ног на галаву. Па-рознаму да нас ставіліся ў гарадах. Напрыклад, нас цудоўна прымалі ў Севастопалі, у Мурманску сам губернатар запрасіў на сустрэчу здымачную групу.

**Аляксандр РЫДВАН:**

— Хачу выказаць вялікую ўдзячнасць нашай здымачнай групе. Кіно пра герояў было зроблена па-геройску прафесійна. Такая тэма — не здымкі, напрыклад, алімпіяды ці фестывалю ў прыгожым месцы. Зусім іншая справа — зняць фільм пра жах. Слёзы ветэранаў і іншых сведкаў перажыць і пераплакаць разам з імі — гэта таксама мужнасць. А пасля і прадэманстраваць. Наш рэжысёр у Севастопалі дзеля кадра ў красавіку нырнуў у ваду ў касцюме матроса, каб паказаць, як з абрыву ў мора скакалі матросы. Вада тады больш дзесяці градусаў не была, і ў ёй плаваў наш рэжысёр, ён жа, лічыце, каскадзёр. Гэта фільм пра жахі, у ім трэба пагрузіцца і выпрацаваць гэта. Мы ганарымся гэтым праектам. Было некалькі здымачных груп: адна брала інтэрв'ю, другая здымала стэндапы, трэцяя — ігравыя эпізоды. Адзін сцэнарыст шукаў матэрыялы і ў цэлым «набіваў тушку», другі — шукаў твары, сведкаў і таксама прагнуў збіраць якую-небудзь фактуру. Дапамагалі матэрыяламі архівы, музеі. У Смаленску сцэнарый нараджаўся «з колаў», супрацоўнікі музеяў далі новую інфармацыю — і на каленях у гасцініцы сцэнарысты нешта перараблялі... Гэта каласальны быў праект. Тут шмат аўтарства. Кожны чалавек са здымачнай групы зрабіў свой унёсак. Суаўтарамі былі ўсе, усе здабывалі розную інфармацыю. Мы настолькі любілі гэты праект, гарэлі ім, што часам страшна становіцца, а ці атрымаецца яшчэ так. Там вельмі шмат трымаецца на энтузіязме, на натхненні. Гэта проста так з халодным сэрцам не зробіш. Было цяжка і лёгка адначасова. Калі б праца была нецікавай, то заўважалі б, што ногі прамакаюць і што горла баліць, і што спалі тры гадзіны, і што ўжо 15 гадзін без адпачынку на вуліцы ў мароз. Здымкі вяліся ў баявых умовах.

**Алеся:** У здымачнай групы перашкод было вельмі шмат. У вядучых — Гасцюхіна і Сігова — свой графік, мы здымалі, калі з-за вывяржэння вулкана неляталі самалёты. Здымалі на вуліцы, здымалі ў любую пару года. Нават у першы пробны стэндап, які рабілі на Лініі Сталіна, — ішоў лівень. Усе ў гразі, прамоклі і здымачная група, і акцёры. Альбо, напрыклад, трэба было зняць крэпасць Шлісельбург. Паколькі ў нас свой графік, едзем зімой, а ў гэты час туды няма навігацыі, прабрацца немагчыма. Мы звяртаемся ў аварыйна-выратавальную службу — і нам ідуць насустрач, даюць лодку, якая едзе і па вадзе, і па лёдзе, і па снезе. Яна ў нас прымерзла — і Сігоў з Гасцюхіным яе штурхалі. Усе знаходзіліся ў аднолькавых умовах, усе былі ў творчым парыве.

У Брэсцкай крэпасці да 6 раніцы мы здымалі адзін стэндап, зараз ён наш самы любімы, калі Сігоў з кацялком бяжыць да Мухаўца. Тады мы адпрацавалі цэлы дзень, вечар, ноч, у 6 раніцы вызваліліся, а ў восем павінны былі ўстаць, каб ехаць на наступныя здымкі. Фільм зроблены неверагоднымі чалавечымі намаганнямі кожнага, каго не вазьмі.

**— 13 болевых кропак, асноўныя бітвы вайны, уласныя ўспаміны ветэранаў... Ці не стварыў АНТ летапіс вайны?**

— Гэта толькі адна старонка. Маштабы трагедыі настолькі вялікія, што і тысячу фільмаў нельга назваць летапісам. Пакуль апошні салдат не распавядзе сваю гісторыю, можна лічыць, што летапіс не скончаны. Ні ў якім разе АНТ не стварыла летапіс. Мы толькі абагулілі і вельмі павярхоўна распавялі пра падзеі. Ведаеце, у чым была наша асноўная праблема, нават бяда, калі пісалі сцэнар? Трэба было вырашаць, што выбраць з таго багацця матэрыялу, каб увайшло ў фільм. Аб кожнай хвіліне вайны — тысячы дакументаў, ёсць тысячы відавочцаў...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота з архіва АНТ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ВЫНІКУ ВЫБУХУ Ў МАСКОЎСКІМ РЭСТАРАНЕ 27 ЧАЛАВЕК ПАРАНЕНА, ДВОЕ ЗАГІНУЛІ

**На паўднёвым захадзе Масквы згарэў двухпавярховы італьянскі рэстаран Il Pittore. У момант пачатку пажару ў рэстаране знаходзіліся каля 50-ці чалавек, праводзілася эвакуацыя.**



На момант падпісання нумара ў друк, было вядома пра дваіх загінулых. У прэс-службе сталічнага ўпраўлення МУС Расіі абвясцілі папярэднюю інфармацыю: 27 пацярпелых (галоўным чынам у іх асколачныя раненні шклом), 22 чалавекі шпіталізаваныя.

У будынку раздаліся прынамсі два выбухі — хутчэй за ўсё, гэта выбухалі газавыя балоны, якіх было шмат у памяшканні. Максімальныя разбурэнні адбыліся ў раёне кухні. Таксама ў будынку цалкам выбіты ўсе шыбы, адбылася частковая дэфармацыя сцен, абваліўся дах. Паводле папярэдняй інфармацыі выратавальнікаў, на першым паверсе будынка адбыўся выбух газу з наступным гарэннем.

### ПОЛЬСКІ ПАЛКОЎНІК ЛЕДЗЬ НЕ ЗАСТРЭЛІЎСЯ ПАДЧАС УЛАСНАЙ ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫІ



**Супрацоўнік ваеннай пракуратуры Польшчы палкоўнік Мікалай Пшыбыл ледзь не застрэліўся падчас уласнай прэс-канферэнцыі ў горадзе Познань, піша Warsaw Business Journal. Пшыбыл застаўся жывы, цяпер, паводле слоў урачоў, яго жыццю нічога не пагражае.**

Прэс-канферэнцыя была прысвечана пытанню меркаванага сачэння супрацоўнікаў ваеннай пракуратуры за журналістамі, якія займаюцца расследаваннем катастрофы самалёта прэзідэнта Польшчы Леха Качыньскага пад Смаленскам. Паводле звестак газеты, пракуроры незаконна атрымлівалі ў тэлефонных аператараў кантактную інфармацыю журналістаў пад маркай іх умяшання ў расследаванне катастрофы.

Пшыбыл выступіў у абарону супрацоўнікаў пракуратуры і запэўніў, што яны не парушалі закон, а толькі перашкаджалі ўцечцы інфармацыі пра расследаванне справы. Затым палкоўнік абвясціў пяціхвілінны перапынак, пасля чаго выйшаў з канферэнц-залы і стрэліў сабе ў галаву. Ён быў неадкладна дастаўлены ў бальніцу. Іншыя падрабязнасці здарэння пакуль не паведамляюцца.

### ПЯЦІМЕТРОВЫЯ ГУРБЫ НАКРЫЛІ ЗАХАД АЎСТРЫІ

**Небывала моцныя снегапады не цішэюць на захадзе Аўстрыі. Толькі за ноч на 9 студзеня ў федэральнай зямлі Фарарльберг выпаў метр снегу. Пасля працяглых снегападаў цяпер там ляжаць гурбы вышынёй у 5 м, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Магутныя снегапады ў заходняй частцы краіны павялічылі небяспеку сходу лавін. У Альпах у раёне Цірол і Арльберга ўжо некалькі дзён захоўваецца вельмі высокая, чацвёртая, ступень лавінанебяспекі па пяцібальнай шкале. Цяпер горныя схілы чысцяць спецыялісты-выбухатэхнікі.

Паралізаваны рух на аўтамабільных дарогах і чыгунцы. У аўстрыйскай зямлі Цірол дагэтуль не ходзяць цягнікі паміж гарналыжнымі курортамі.

Пакуль мясцовыя жыхары разграбаюць машыны і расчышчаюць падыходы да дамоў, больш за 30 тысяч турыстаў блакіраваныя ў гатэлях з-за спуску лавін. Групу турыстаў з Германіі давялося нават эвакуіраваць з гарналыжнага курорта армейскімі самалётамі, інакш яны маглі апынуцца жыўцом пахаваныя пад снегам.

### КУРС ЕЎРА ДА ДОЛАРА ЎПАЎ ДА МІНІМАЛЬНАГА ЎЗРОЎНЮ ЗА 16 МЕСЯЦАЎ

**Курс еўра ў дачыненні да долара апусціўся да мінімальнага ўзроўню за 16 месяцаў (з верасня 2010 года — $1,2666 за еўра паведамляюць інфармагенцтвы.**

Не менш рэкордным стала падзенне еўрапейскай валюты ў дачыненні да японскай ены. На Сіднейскай валютнай біржы курс еўра ў дачыненні да ены зваліўся да самага нізкага ўзроўню за ўвесь час існавання еўрапейскай валюты. Сёння за адзін еўра тут давалі ўсяго 97,28 японскай ены.

Эксперты біржы тлумачаць падзенне еўра паніжэннем на мінулым тыдні крэдытнага рэйтынгу пазыковых аблігацый урада Венгрыі да спекуляцыйнага ўзроўню, а таксама няпэўнай фінансава-эканамічнай сітуацыяй у Іспаніі і Францыі. Зніжэнне курсу еўра абумоўлена таксама навінамі з Еўропы. 7 студзеня адно ўплывовае нямецкае выданне паведаміла, што МВФ губляе давер да грэчаскіх палітыкаў і сумняваецца ў іх здольнасці справіцца з праблемамі ў дзяржаўных фінансах краіны.

## Ну і ну!

### Паміж алкаголем і злачынствамі — прамая залежнасць

**Упершыню ў Магілёўскай вобласці раскрыты ўсе наўмысныя забойствы. Пра гэта паведаміў грамадскасці начальнік УУС Магілёўскага аблвыканкама Фёдар БАЛЕЙКА, які падвёў вынікі 2011 года.**

У рэгіёне ўзровень злачыннасці летась скараціўся на 3%. Паменшылася колькасць цяжкіх злачынстваў, асноўных відаў злачынстваў супраць жыцця і здароўя грамадзян. Гэтую станоўчую дынаміку кіраўніцтва органаў унутраных спраў звязвае найперш з увядзеннем абмежаванняў продажу алкаголю: істотна скарацілася колькасць крам, якія гандлююць спіртнымі напоямі ўначы, а таксама не заўсёды можна набыць танныя пладова-ягадныя віны.

Паводле статыстыкі, 90% цяжкіх і асабліва цяжкіх цялесных пашкоджанняў наносяцца п'янымі людзьмі, таму Фёдар Балейка лічыць, што міліцыя, як і ўсё грамадства, павінна займацца прафілактыкай.

**Алена КАЗЛОВА.**

## Спорт-тайм

### У АБЕРХОФЕ ДАР'Я ДОМРАЧАВА ЗАНЯЛА ДРУГОЕ МЕСЦА Ў СПРЫНЦЕ

*А вось у мас-старце выступіла няўдала*

Лідар нашай біятлоннай зборнай Дар'я Домрачава заняла другое месца ў спрынтарскай гонцы на этапе Кубка свету ў Аберхофе. Дар'я дапусціла адзін промах, але дзякуючы адметнай хуткасці апярэдзіла расіянку Вольгу Зайцаву, якая адстралялася на нуль. Вольга Зайцава ў выніку стала трэцяй. А выйграла гонку немка Магдалена Нойнер, якая таксама прайшла дыстанцыю без промахаў. Добры вынік нечакана паказала яшчэ адна беларуска, Настасся Дубарэзава: не дапусціўшы ніводнага промаху, яна заняла сёмае месца.

А вось заключную гонку, якая ў нядзелю завяршала праграму Кубка свету ў Аберхофе, Дар'я Домрачава правяла няўдала. Бегла па лыжні беларуска, як заўсёды, хутка, а вось стральба яе падвяла. На 4-х рубяжах біятланістка не закрыла 5 мішэняў. На першым рубяжы Дар'я прамахнулася двойчы і адразу «адляцела» на 28-е месца. З касмічнай хуткасцю яна даганяла лідараў пасля 2-й стральбы, якую правяла на нуль, і выйшла на 11-е месца. Крыж на надзеях паставіла трэцяя стральба, дзе Дар'я зноў зрабіла два промахі. А калі на чацвёртым стрэльбішчы яна прамахнулася яшчэ раз, шанцаў на п'едэстал не засталося ўвогуле. Усё, што здолела зрабіць беларуска, — падцягнуцца да лідараў, заняўшы выніковае сёмае месца. Выйграла гонку зноў Магдалена Нойнер, якая, дарэчы, таксама тройчы прамахнулася. Зноў парадавала Настасся Дубарэзава, якая ўпершыню ўдзельнічала ў мас-старце і, дапусціўшы адзін промах, заняла высокае 10-е месца.

### ВЫЕЗД «ДЫНАМА» Ў СІБІР НЕ АТРЫМАЎСЯ

Выязная серыя ў Сібіры мінскаму «Дынама» не ўдалася. З дзевяці магчымых ачкоў «зубры» ўзялі ўсяго 2. «Дынама» прайграла новакузнецкаму «Металургу», па булітах адолела «Амур» і саступіла «Сібіры» — 11-й камандзе Усходняй канферэнцыі. Вынік, мякка кажучы, не надта адметны для аднаго з лідараў чэмпіянату.

Мінчане апярэдзілі гаспадароў па колькасці кідкоў — 47 супраць 23. Але растранжырылі большасць сваіх момантаў. «Сібір» адкрыла лік на 27-й хвіліне, а на 34-й Джэф Плат аднавіў раўнавагу — 1:1. Але ўжо на 36-й гаспадары зноў выйшлі наперад і больш даганаць сябе не дазволілі. Трэцюю шайбу беларусы атрымалі ў большасці, і калі Іргл скараціў адставанне, «Сібір» закінула чацвёртую шайбу — 4:2. Пятую шайбу «Дынама» атрымала ў пустыя вароты, калі замяніла варатара на шостага палявога гульца.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

### БЛІЖЭЙ ДА ВЯСНЫ ВЫПАДКАЎ АДРУ СТАНЕ БОЛЬШ

**Эпідэміялагічная сітуацыя па адры ў Еўрапейскім рэгіёне працягвае ўскладняцца. Паводле прагнозаў Еўрапейскага цэнтра па кантролі за захворваннямі, пік захваральнасці чакаецца ў лютым-маі гэтага года.**

Як паведамляюць у Міністэрстве аховы здароўя Беларусі, у краінах Еўрасаюза зарэгістравана звыш 30 тысяч выпадкаў адру. У 8 выпадках захворванне завяршылася гібеллю, у 24 — ускладнілася энцэфалітам. Найбольшая колькасць выпадкаў выяўлена ў Францыі, Італіі, Румыніі, Іспаніі, Германіі. Успышкі адру працягваюцца ва Украіне (Львоўскай, Івана-Франкоўскай, Валынскай, Роўненскай, Закарпацкай абласцях, Кіеве). Рост захваральнасці на адзёр ва Украіне звязваюць не толькі з неспрыяльнай сітуацыяй у Еўропе, але і масавымі адмовамі ўкраінцаў ад вакцынацыі. У Расіі самая складаная сітуацыя адзначаецца ў Паўночна-Каўказскай і Паўднёвай федэральных акругах.

Згодна з праведзеным летась у нашай краіне вывучэннем папуляцыйнага імунітэту, абарончы ўзровень антыцелаў да віруса адру маюць 91,4 працэнта грамадзян, што з'яўляецца дастатковым для кантролю над інфекцыяй. Разам з тым, ва ўзроставай групе 20-29 гадоў узровень папуляцыйнага імунітэту склаў 84,2 працэнта, а таму рызыка ўзнікнення і распаўсюджвання адру з'яўляецца досыць высокай.

Міністэрства аховы здароўя настойліва рэкамендуе:

- у выпадках першых прыкмет захворвання (насмарк, кан'юнктывіт, кашаль і сып) неадкладна звярнуцца да ўрача;
- падчас выезду за мяжу пацікавіцца ва ўрачоў звесткамі аб вакцынацыі супраць адру;
- асобам ва ўзросце 20-29 гадоў — не прышчэпленым, тым, хто атрымаў адну дозу вакцыны супраць адру або не мае звестак аб прышчэпках, вакцынавацца супраць адру.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Сучасныя тэхналогіі

# ХТО АДМОВІЎСЯ — ТОЙ ПРАЙГРАЎ

**БУДАЎНІЦТВА ў краіне новых малочных фермаў і рэканструкцыя тых, што існуюць, працягваецца, хоць фінансавая нестабільнасць зрабіла сваю карэкціроўку. Наколькі такі кірунак у жывёлагадоўлі аказаўся апраўданым? Тут за лепшае будзе звярнуцца да канкрэтнага прыкладу.**

Амаль два гады ў СВК «Ляхавіцкі» працуе новая малочнатаварная ферма, узведзеная з выкарыстаннем самых сучасных тэхналогій. Гаспадарка будавала ферму самастойна, на ўвесь комплекс было затрачана 7 мільярдаў рублёў, з якіх 5 мільярдаў складае крэдыт, узяты пад 13 працэнтаў. Затраты вялікія, а якая аддача?

Перад тым, як павесці размову з кіраўніком СВК «Ляхавіцкі» Аляксандрам Вітко, адзначу, што наяўнасць новай фермы яшчэ не дае гарантыі рэкордных надояў.

**— Аляксандр Іванавіч, два гады — гэта дастатковы тэрмін, каб падвесці рысу. І што гаспадарка атрымала ад новай фермы?**

— Будаўніцтва фермы нам далося нялёгка, бо крэдыт у нас не быў ільготным, ды і тое ўдалося яго ўзяць толькі пры дапамозе першага намесніка міністра сельскай гаспадаркі Надзеі Каткавец. Было гэта пяць гадоў таму. На нейкі час мы нават зарплату замарозілі — будавалі ферму. А сёння ўсё нармалізавалася, за крэдыт разлічваемся. Кожная карова на гэтай ферме дае на тысячу кілаграмаў малака больш, і 99 працэнтаў яго ідзе гатункам «экстра». А гэта 3183 рублі за кілаграм. Надоі за мінулы год на новай ферме дасягнулі ў сярэднім 7652 кілаграмы ад каровы.

**— Адкуль вы ўзялі кароў? Бо бывае, што на новую ці рэканструяваную ферму даводзіцца ставіць не самы лепшы статак: іншага няма.**

— Магчыма, я некага і расчарую, але ў нас каровы толькі мясцовыя, і ніякіх замежных у гаспадарку не завозілі. Фарміруем дойны статак сваімі сіламі за кошт адбору, правільнай племяннай работы, вядома, праз штучнае асемяненне.

> **Сапраўдны гаспадар тым і вылучаецца, што здольны ўлавіць момант, убачыць перспектыву і выкарыстаць сітуацыю ў сваіх мэтах.**

**— І што, паставілі карову ў новае стойла — і яна адразу ж малака на тысячу кілаграмаў больш дала?**

— А тут нічога дзіўнага няма. Жывёла, як і чалавек, таксама рэагуе на камфортнае ўтрыманне. Некалі людзі не шкадавалі ні сябе, ні жывёлу. Калі гэта зімой карову паілі цёплай вадой? Можа, нейкі гаспадар і рабіў гэта, але як выключэнне, а тут у паілках — падагрэтая вада. Значную ролю адыгрывае і комплекснае кармленне. У розныя перыяды яно неаднолькавае, неабходна пільна сачыць за гэтым.



На фота *(злева направа)*: начальнік комплексу Ігар БУБЕНЧЫК, намеснік старшыні СВК па жывёлагадоўлі Уладзімір КСЁНЖЫК, старшыня СВК «Ляхавіцкі» Аляксандр ВІТКО ў новым цялятніку.

Фота Сымона СВІСТУНОВІЧА.

**— Амаль усё малако на новай ферме ідзе гатункам «экстра», і ў чым тут сакрэт? Добра вядома, наколькі складана дасягнуць такога еўрапейскага ўзроўню.**

— І тут адыгралі сваю ролю сучасныя тэхналогіі. У даільнай зале стаіць нямецкае абсталяванне, і калі раней малако бегла па трубах дзясяткі метраў, то цяпер яно адразу трапляе ў халадзільныя камеры. Тыя трубы як ні мылі, а ўсё роўна ідэальнай чысціні дасягнуць не маглі.

**— Значыць, з новай фермай вы не памыліліся?**

— Гаспадарка аказалася ў выйгрышы. А ў якіх умовах утрымліваюцца там цяляты! Не ў кожнай сям'і дзеці гадуюцца ў такой чысціні. Дарэчы, падзяжу цялят у нас няма, а гэта, між іншым, залог абнаўлення статка. Калі мы хочам у жывёлагадоўлі (ды і ў сельскай гаспадарцы ў цэлым) быць на перадавых пазіцыях, то павінны рабіць стаўку на сучасныя тэхналогіі.

Пабудаваная малочнатаварная ферма — гэта комплекс з кароўнікаў, цялятніка, даільнай залы, кармавой пляцоўкі... У даільнай зале ўвесь працэс камп'ютарызаваны, а абслуговы персанал прайшоў спецыяльнае навучанне.

Дзе гаспадар — там і малако, і дастойнае жыццё, бо зарплата на МТФ — у межах трох мільёнаў, а сярэдні заробак па сельгаскааператыве — 1,8 млн рублёў. Пры такім раскладзе, напэўна, няма праблемы з кадрамі?

— Праблемы няма. Праўда, іншы раз некага даводзіцца пазбаўляць прэміі ці нагогул выводзіць з калектыву, але праз нейкі час чалавек прыходзіць прасіцца назад... Шкадуем не яго, а сям'ю... Уся бяда ад гарэлкі, — разважае Аляксандр Вітко.

Хоць у СВК «Ляхавіцкі» ўсяго 3,5 тысячы гектараў не самай лепшай зямлі, але гаспадарка — адна з лепшых у вобласці. Ёсць у раёне сельгаскааператывы, якія маюць зямлі ў два-тры разы больш, а вось не захацелі будаваць новыя МТФ. Ляхавіцкі раён — адзін з самых стабільных на Брэстчыне, а на яго тэрыторыі ўзведзена толькі дзве новыя фермы — у вядомым нам СВК «Ляхавіцкі» ды сельгаскааператыве «Шлях новы».

— Хто адмовіўся ад будаўніцтва новых фермаў, той прайграў. Кіраўнік гаспадаркі, які не захацеў узяць крэдыт пад 1 працэнт на 9 гадоў, аказаўся непразорлівым. Я асабіста ўгаворваў будаваць фермы, — кажа **старшыня Ляхавіцкага райвыканкама Дзмітрый БУРДУК.**

**— У «адказнікаў», напэўна, былі свае аргументы?**

— Вось прыехаў на сход у адну гаспадарку, на якім людзі павінны былі прагаласаваць за ўзвядзенне новай фермы. А тут падымаецца галоўны спецыяліст і кажа: маўляў, калі пачнём будаваць ферму, то не будзе росту заработнай платы. Рэакцыя прысутных была адназначная: яны прагаласавалі супраць.

**— А што рабіць у такім выпадку?**

— Даволі значная рэканструкцыя фермаў праведзена ў СВК «Тальмінавічы» і іншых гаспадарках, а тыя кіраўнікі, што не выкарысталі сітуацыю, сёння ўжо не дагоняць, бо вырас кошт матэрыялаў. Той, хто зрабіў стаўку на сучасныя тэхналогіі, будаваў і мадэрнізаваў фермы, пажынае добры ўраджай: закупачныя цэны на малако рэзка павысіліся.

Калі прымалася рашэнне аб шырокамаштабнай мадэрнізацыі ў жывёлагадоўлі, ніхто не чакаў такіх узрушэнняў у фінансавай сістэме. Але ж сапраўдны гаспадар тым і вылучаецца, што здольны ўлавіць момант, убачыць перспектыву і выкарыстаць сітуацыю ў сваіх мэтах.

Той жа Аляксандр Вітко падчас распаду Саюза ўсе савецкія рублі кінуў на закупку тэхнікі ды запчастак, і калгас, нават у тых умовах, выстаяў. А той, хто трымаў грошы на рахунках, застаўся без капейкі. Былі і тыя, што пачалі распрадаваць калгасную тэхніку.

Адсюль і выснова: пры любой эканамічнай сістэме, пры самых неспрыяльных умовах апошняе слова заўсёды будзе за гаспадаром.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
*Ляхавіцкі раён.*

# Не стала Пятра Васілеўскага,
## яшчэ аднаго іграка са слаўнага складу чэмпіёнаў СССР, мінскага «Дынама»



Учора з адной з мінскіх клінік прыйшло сумнае паведамленне: памёр Пётр Васілеўскі, нападаючы «залатога» складу мінскага «Дынама»-82, майстар спорту СССР. Не стала ўжо чацвёртага іграка з той славутай каманды чэмпіёнаў СССР — пасля Віктара Янушэўскага, Аляксандра Пракапенкі, Юрыя Курненіна.

Тыя , хто хадзіў на пачатку 80-х на стадыён «Дынама», добра памятаюць, як адгукаліся трыбуны на кожны гол Васілеўскага: «Голу Васілеўскага Пятра — ура! ура! ура!». Усяго у чэмпіянатах Савецкага Саюза нападаючы мінскага «Дынама» правёў 277 матчаў і забіў 59 галоў. Акрамя «Дынама», адзін сезон Пётр правёў у складзе ташкенцкага «Пахтакора», каманда якога ў 1978 годзе загінула ў авіякатастрофе (тады было прынята рашэнне, што кожны з клубаў дэлегуе ў Ташкент па 1-2 ігракі для ўзмацнення ўзбекскай каманды). У 1982 годзе Пётр Васілеўскі ўвайшоў у спіс 33 наймацнейшых ігракоў чэмпіянату СССР. Аўтар двух хет-трыкаў у чэмпіянаце СССР. «Нам было за гонар біцца за сваю рэспубліку, расказваў ён карэспандэнту «Звязды роўна 10 гадоў таму, напярэдадні 20-годдзя той перамогі «Дынама». — Памятаю, як мы гулялі па Маскве з Пракопам і да нас падышлі двое: «Хлопцы, абыграйце «Спартак», каб толькі не Кіеў стаў чэмпіёнам». І яны абыгралі. І Васілеўскі забіў адзін з чатырох тых галоў...

У 1989-1991 гадах трэніраваў клуб КІМ (Віцебск), затым кароткі час быў арбітрам. У канцы 2000-х — трэнер юнацкай зборнай (да 16 гадоў) Беларусі, з 2011 года — галоўны трэнер Мінскага клуба «Ніка», які выступае ў чэмпіянаце Мінска. У Пятра Пятровіча засталіся жонка Ірына, з якой ён ажаніўся ў 18 гадоў, сыны Андрэй (гуляў за «Дынама-Юні») і Антон займаўся ў СДЮШАР-5 (гуляў за дубль БАТЭ), але абодва з футболам закончылі, а таксама ўнукі Мікіта, Глеб, Яна.

20 января 2012 в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров **ОАО «Полесьежилстрой»**.

**Повестка дня:**
1. О совершении сделок общества.
Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Базановой, 19.
Начало регистрации участников собрания: 10.30.

*УНП 200050191*

Нашы дзеці

# ДЗЯРЖАВА ПАВЯЛІЧВАЕ ВЫДАТКІ НА ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЯЦЕЙ-СІРОТ

**З 1 студзеня ў Беларусі павялічыліся грашовыя нормы выдаткаў на дзяржаўнае забеспячэнне дзяцей-сірот.**

Як патлумачылі журналісту «Звязды» ў прэс-службе Міністэрства адукацыі, пастановай Савета Міністраў прадугледжана павелічэнне грашовых нормаў выдаткаў на харчаванне для дзяцей-сірот розных катэгорый. Напрыклад, для немаўлят, якія знаходзяцца ў дамах дзіцяці, грашовыя нормы былі павялічаны ўдвая. Для выхаванцаў дзіцячых дамоў і школ-інтэрнатаў для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі, дапаможных школ-інтэрнатаў, спецыяльных агульнаадукацыйных школ-інтэрнатаў, сацыяльна-педагагічных цэнтраў, спецыяльных вучэбна-выхаваўчых і спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установ, прыёмнікаў-размеркавальнікаў для непаўналетніх, дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця (у тым ліку прызначаных для дзяцей-інвалідаў з фізічнымі парушэннямі) грашовыя нормы павышаны ў сярэднім у 1,7 раза.

Дзецям-сіротам — навучэнцам і студэнтам дзённых аддзяленняў ПТУ, ССНУ і ВНУ, а таксама тым, хто навучаецца на дзённых падрыхтоўчых аддзяленнях ВНУ, грашовыя выдаткі на харчаванне таксама павялічаны ў 1,7 раза.

Таксама ўрадавая пастанова павялічвае ў 1,9 раза штомесячныя выплаты на харчаванне, адзенне, абутак, мяккі інвентар, абсталяванне і г.д., якія выплачваюцца сем'ям, што выхоўваюць дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без бацькоўскай апекі. Размова ідзе аб дзецях, якія выхоўваюцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, дзіцячых вёсках (гарадках), у апякунскіх і прыёмныя сем'ях.

Пры гэтым грашовая кампенсацыя дзецям-сіротам пры працаўладкаванні вырасла ў 2,2 раза. У столькі ж разоў выраслі штомесячныя выплаты на дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без бацькоўскай апекі, якія знаходзяцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, у апякунскіх і прыёмных сем'ях, за карыстанне кватэрным тэлефонам (акрамя міжгародніх і міжнародных размоў), бытавымі паслугамі (паслугамі пральняў, цырульняў, па рамонце абутку). У сярэднім у 1,3 раза вырасла для гэтай катэгорыі грамадзян і штомесячная грашовая кампенсацыя за пражыванне па дагаворы найму жылля на перыяд навучання ва ўстановах адукацыі.

Пастановай таксама прадугледжана штоквартальнае ўнясенне ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапаноў па павелічэнні грашовых нормаў выдаткаў на дзяржаўнае забеспячэнне дзяцей-сірот.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Пытальнік

# Хачу набыць бінокль, падкажыце...

***Прывітанне! Не магу знайсці адказ на пытанне: як вызначыць кратнасць бінокля? У продажы ёсць кітайскія, польскія. Напрыклад, напісана на біноклі: 16х50. Гавораць, што 16 — гэта і будзе кратнасць. Але калі ў яго паглядзіш, дык набліжае слаба. Іншыя кажуць, што кратнасць — нешта зусім іншае. Хто мае рацыю? І дзе можна набыць бінокль з «цэйсаўскай» оптыкай ці маркі?***

**Б.АСЕЦКІ,** *г. Бабруйск*

На жаль, наш чытач не паведаміў, для якіх мэт яму патрэбны бінокль. Бо, скажам, вышэйназваныя маркія біноклі адрозніваюцца, у прыватнасці, ад палявых больш высокай устойлівасцю да неспрыяльных умоў надвор'я. Натуральна, што такая «опцыя» будзе каштаваць дадатковых грошай. А ці сапраўды аўтару ліста давядзецца працяглы час карыстацца біноклем пры нейкіх неспрыяльных умовах? Увогуле, крытэрыі падбору бінокля некалькі «размытыя»: або славутая нямецкая якасць, або высокая ўстойлівасць да неспрыяльных умоў надвор'я, або высокі паказчык кратнасці... Таму, прабачце, зарыентаваць можам толькі ў агульных рысах.

Сапраўды, пры выбары бінокля найперш звяртаюць увагу на кратнасць. Ад гэтага паказчыка ў большай ступені залежыць, наколькі блізка да чалавека будзе аб'ект, які ён назірае. Напрыклад, калі да нейкага аб'екта назірання 100 метраў, дык пры карыстанні 10-кратным біноклем будзе выходзіць так, быццам да яго адлегласць складае толькі 10 метраў. Кратнасць — гэта першая лічба ў маркіроўцы. Другая — дыяметр аб'ектыва ў міліметрах. (Гэта калі гаварыць пра оптыку з пастаяннай кратнасцю, якая мае толькі адну лічбу перад значком «х». Але ёсць яшчэ біноклі з пераменнай кратнасцю, напрыклад, ад 10 да 80.) Аднак трэба ведаць і іншае. Чым большая кратнасць, тым мацней бінокль набліжае аддаленыя аб'екты, але па меры павелічэння кратнасці камфортнасць назірання зніжаецца. Адлюстраванне можа скакаць ад драбнейшых рухаў. Гэта азначае, што пры карыстанні біноклем з высокай ступенню кратнасці (звыш 10), каб не было такіх хібаў, лепш выкарыстоўваць максімальна стабільнае яго становішча. Напрыклад, з дапамогай штатыву, або проста абапёршыся на нейкі прадмет. Самыя хадавыя мадэлі бінокляў, па адной з версій класіфікацыі, маюць кратнасць 6-8. (Калі больш падрабязна, дык біноклямі з малым павелічэннем лічацца 2-4-кратныя, з сярэднім павелічэннем — 6-8-кратныя. Біноклі з вялікім павелічэннем — гэта 10-, 12-, 16- і нават 20-кратныя. Апошнія маюць большыя габарыты і вагу, ну і, зразумела, кошт.) Нарэшце, чым вышэйшая кратнасць, тым менш поле зроку. У бінокляў з кратнасцю ад 7 да 10 яно складае 70-75 працэнтаў, што дастаткова для камфортнага назірання. Гэта — калі адносна коратка, паколькі мы пералічылі не ўсе асноўныя характарыстыкі бінокляў. Больш падрабязна даведацца пра іх можна з розных крыніц, у тым ліку і ў крамах ад прадаўцоў-кансультантаў.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Нерудпром» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: Минская область, Минский р-н, севернее д. Захаричи, в составе:**

**Лот № 1:** корпус промывки (здание специализированное иного назначения инв. № 600/С-59848), об. пл. 2211,7 кв.м. Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 1 890 240 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,2241 га.
**Лот № 2:** корпус вторичного дробления (здание специализированное иного назначения инв. № 600/С-59846), об. пл. 1284,8 кв.м. Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 1 157 760 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,2240 га.
**Лот № 3:** корпус первичного дробления (здание обрабатывающей промышленности иного назначения инв. № 600/С-59856), об. пл. 381 кв.м. Начальная цена с НДС – 512 400 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,0339 га. Объекты обременены договорами аренды.

**Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.**

Аукцион состоится **10.02.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.02.2012** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by.**

**Страховой полис ЗАО «СК «ЭРГО» серия БО № 0199500 считать недействительным.**

Утерянную печать ООО «Старый Свет-Принт» (УНП 100177408) считать недействительной.

Разам супраць раку

# ДЫЯГНАЗ ПАСТАЎЛЕНЫ. ШТО ДАЛЕЙ?

**ШТО можа зрабіць не асобна медыцына, а у цэлым — дзяржаўныя структуры, грамадскія арганізацыі, рэлігійныя канфесіі, каб дапамагчы тым, каго ўжо немагчыма вылечыць, каму пастаўлены дыягназ раку 4-й стадыі? Як пазбегнуць болю і пакут? Што рабіць сваякам, калі ў сям'і з'явіўся такі хворы? А што рабіць адзінокаму невылечна хвораму? Літаральна некалькі гадоў таму хворыя і іх сем'і заставаліся сам-насам з бядой і не задаваліся падобнымі пытаннямі, бо ведалі, што не знойдуць адказу...**

Аднак зараз наша краіна пераймае заходні вопыт, які сведчыць аб тым, што паняцце якасці жыцця павінна суправаджаць чалавека не толькі пры нараджэнні або пакуль ён здаровы і актыўны, але і да самай апошняй хвіліны. Гэтая тэма стала прадметам абмеркавання падчас чарговага «круглага стала» «Разам супраць раку», арганізаваным Мясцовым дабрачынным фондам «Адраджэнне-Старт» сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

«У цэнтры нашай увагі — чалавек, але чалавек не ў росквіце гадоў, а той, хто сутыкнуўся з анкапаталогіяй, — такімі словамі работу «круглага стала» распачаў **член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, прафесар, анколаг Іосіф ЗАЛУЦКІ.** — Што тычыцца ўласна медыцынскай дапамогі, то для яе аказання ў краіне створана сур'ёзная матэрыяльна-тэхнічная і прафесійная база. Аднак надыходзіць момант, калі радыкальнае лячэнне правесці ўжо немагчыма. Тут у нас назіраецца прабел, а павінна быць аб'яднанне намаганняў медыцыны, прадстаўнікоў улады, грамадскіх арганізацый, духавенства...».

Сёння ў краіне найлепшым чынам медыка-сацыяльную, патранажную работу з анкапацыентамі, хворымі, якія знаходзяцца ў тэрмінальнай стадыі захворвання, з членамі іх сем'яў арганізавалі грамадскія аб'яднанні. Такая работа ажыццяўляецца сіламі супрацоўнікаў і валанцёраў Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, Саюза сястрынстваў міласэрнасці Беларускай праваслаўнай царквы, а таксама Грамадскай яўрэйскай дабрачыннай арганізацыяй «Хэсэд Рахамім», Беларускім дзіцячым хоспісам, а таксама Дзяржаўнай установай «Бальніца паліятыўнай дапамогі «Хоспіс». Гэтыя арганізацыі назапасілі за апошнія гады велізарны досвед аказання ў першую чаргу медыцынскай і псіхалагічнай дапамогі невылечна хворым. Так, Саюз сястрынстваў і Чырвоны Крыж маюць нават свае дапаможнікі па спецыяльным доглядзе цяжкахворых людзей. Рэлігійныя канфесіі маюць немалы досвед у аказанні маральнай падтрымкі як хворым, так і іх блізкім. Аднак практыка паказвае, што для больш эфектыўнага развіцця паліятыўнай дапамогі патрабуецца аб'яднанне намаганняў самых розных бакоў. Пачынаючы ад валанцёраў і заканчваючы прафесіяналамі, падрыхтаванымі для работы менавіта з вышэйназванай катэгорыяй хворых.

**Першы намеснік старшыні Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ігар ЮРКЕВІЧ:**

— Асноўнай задачай сістэмы аховы здароўя з'яўляецца захаванне і ўмацаванне здароўя насельніцтва, павелічэнне працягласці жыцця, зніжэнне смяротнасці. Анкалагічныя захворванні займаюць другое месца ў структуры прычын смяротнасці, а таму вялікія намаганні накіроўваюцца на выяўленне гэтых захворванняў на ранніх стадыях, укараненне новых тэхналогій у іх лячэнні. Для рэалізацыі гэтых мэт прадугледжана далейшае развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы гарадскога анкалагічнага дыспансэра — будаўніцтва і рэканструкцыя карпусоў, закупка новага высокатэхналагічнага медыцынскага абсталявання.

У горадзе таксама распрацавана канцэпцыя аказання паліятыўнай дапамогі, згодна з якой прадугледжана ўдасканаленне арганізацыі гэтага віду дапамогі, кансалідацыя мэтанакіраваных намаганняў арганізацый сістэмы аховы здароўя і сацыяльнай абароны, прадстаўнікоў навукі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, духавенства, валанцёраў для забеспячэння якасці жыцця хворых, якія знаходзяцца ў тэрмінальнай стадыі захворвання, і членаў іх сем'яў.

— Няма чалавека, які не сутыкнуўся б на працягу свайго жыцця з гэтай тэмай, — кажа **кіраўнік Мясцовага дабрачыннага фонду «Адраджэнне-Старт» Алена РАЗЛАДАВА.** — Мы ўжо другі раз збіраем падчас «круглага стала» зацікаўленыя бакі, вядзём размову аб тым, што ў тых жа грамадскіх арганізацый ёсць рэсурсы, якія трэба выкарыстоўваць. Ёсць ужо нават канкрэтныя, створаныя агульнымі намаганнямі карысныя праекты, у тым ліку 13-хвілінны фільм «Хоспіс. Як ён ёсць». Але ў пакупцы падобнага кшталту паслуг грамадскіх арганізацый павінна быць зацікаўлена дзяржава. Неабходна ствараць і адпаведную нарматыўную базу. На жаль, нават на нашу прапанову прыняць удзел у пасяджэнні такога «круглага стала» (а значыць, стаць удзельнікам дыялогу) адгукаецца пакуль толькі заканадаўчая ўлада, але не заўсёды выканаўчая...



Падчас прэзентацыі сістэмы работы з анкапацыентамі Саюза сястрынстваў міласэрнасці.

Прадстаўнікі духавенства, якіх мы таксама запрашаем да абмеркавання тэмы анкалогіі і паліятыву, кажуць аб тым, што і маральная падтрымка павінна быць прафесійнай, адладжанай, каб у адчаі людзі не траплялі ў рукі шарлатанаў... Расійскі вопыт паказвае, што сёння неабходна гаварыць і аб стварэнні груп з ліку пацыентаў. Гэта дапамагае ім вырашаць нейкія свае спецыфічныя праблемы — знаходзіць адказы на юрыдычныя пытанні, атрымліваць прафесійную ацэнку і незалежную экспертызу прызначанага лячэння, што часам ратуе пацыентам жыццё. Аб гэтым, у прыватнасці, гаварыла медыцынскі дырэктар Няўрадавага партнёрства «Роўнае права на жыццё» Маргарыта Макарава (Масква).

Вельмі важным застаецца і пытанне матэрыяльнага заахвочвання бізнэсу ў справе аказання дабрачыннай дапамогі. Зараз у Міністэрстве эканомікі знаходзіцца на разглядзе законапраект аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве. Закон такога кшталту павінен паспрыяць эфектыўнаму выкарыстанню грашовых рэсурсаў для павышэння якасці і колькасці медыка-сацыяльных, патранажных паслуг, своечасовых і даступных кожнаму, хто мае патрэбу ў паліятыўнай дапамозе. Асабліва патрэбны законы аб сацыяльным заказе і аб паліятыўнай дапамозе. Яны ўрэгулявалі б шэраг пытанняў, адказы на якія пакуль знаходзяцца з пэўнай цяжкасцю.

**Галоўны ўрач Бальніцы паліятыўнага догляду «Хоспіс» Вольга МЫЧКО:**

— Паліятыўная дапамога фарміруецца ў сталіцы згодна з пэўнымі стандартнымі падыходамі. Паліятыў мае на ўвазе не толькі купіраванне болю і іншых сімптомаў (інакш кажучы, уласна медыцынскі аспект), але і аказанне псіхалагічнай, сацыяльнай і духоўнай падтрымкі. Усё гэта неабходна для дасягнення найлепшай якасці жыцця хворых і членаў іх сем'яў. Паліятыўная дапамога можа аказвацца як непасрэдна ў медустановах, якія не спецыялізуюцца на аказанні дапамогі такога кшталту, або медыцынскімі работнікамі розных спецыяльнасцяў, якія маюць дадатковую паслядыпломную адукацыю па паліятыўнай медыцыне, так і, зразумела, спецыялістамі ў галіне паліятыўнай медыцыны ў асобных падраздзяленнях — аддзяленнях і цэнтрах паліятыўнай дапамогі, хоспісах.

Наш хоспіс аказвае найперш медыцынскую і псіхалагічную дапамогу, часткова — сацыяльную і духоўную. Але сёння мы кажам аб тым, што неабходна развівацца далей, паколькі колькасць людзей, якім неабходна паліятыўная дапамога, пастаянна расце. Грамадскія, дабрачынныя арганізацыі бяруць на сябе частку справы, робяць тое, што па сілах.

Варта разумець, што Беларусь знаходзіцца пакуль на пачатку шляху арганізацыі паліятыўнай дапамогі, выпрацоўкі ўласнага стандарту забеспячэння якасці жыцця нашых грамадзян. Гэты глабальны, магутны накірунак адназначна не можа існаваць без дзяржаўнай падтрымкі. І такой падтрымкай па першым часе стала стварэнне нашага хоспіса. Усведамленне неабходнасці развіцця паліятыўнай дапамогі (у тым ліку пашырэння сеткі хоспісаў у краіне) замацавана ў раздзеле 1.2 пратакола даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2010 года №35. Паколькі будынак, у якім размяшчаецца наш хоспіс, не дазваляе пашырацца і браць большую колькасць пацыентаў, 15 лістапада 2011 года Камітэт па ахове здароўя Мінгарвыканкама прыняў рашэнне аб арганізацыі хоспіснага аддзялення з выязной службай на базе 11-й гарадской клінічнай бальніцы.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Меркаванне

# САЦЫЯЛЬНАЕ ЖЫЛЛЁ — ВЫРАШЭННЕ ПРАБЛЕМЫ

**Новы год, як народжанае дзіця. Бацькі дзіцяці радуюцца, адзначаюць народзіны, а затым, здараецца, усё жыццё ад яго плачуць. Гэтаксама і з новым годам. Усю ноч страляюць петарды, вокны і ноччу свецяцца ў многіх кватэрах... А што нясе нам гэты год? З мінулым годам усё прасцей, бо яго ўжо пражылі.**

Якім цяжкім ні быў 2011 год, але наша грамадства выстаяла на дзіва спакойна. А звязана гэта з тым, што за многія стагоддзі ў беларусаў былі толькі два перыяды, калі ім жылося лягчэй. Людзі старэйшага пакалення ўспамінаюць «брэжнеўскі застой» і «суверэнны перыяд» да 2011 года. Пра першы перыяд кажуць: «А чаго тады не хапала?», а пра другі — «Пажылі!»

Тым не менш, мінулы год не быў адназначным. Напрыклад, пашчасціла Ганцавічам. З нагоды Дня пісьменства райцэнтр непазнавальна абнавіўся. А ў Бярозе прайшлі абласныя «Дажынкі», і гораду таксама нешта перапала. На фоне крызісу, напэўна, нейкія станоўчыя падзеі, няхай і невялікія, адбыліся ў кожным раёне, горадзе. Вось і ў Баранавічах 21 сям'я атрымала сацыяльнае жыллё ў 45-кватэрным доме — перад Новым годам ім уручылі дагаворы. У мерапрыемстве прымаў удзел старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар, падзея гэтая для горада была значнай.

Кватэры атрымалі шматдзетныя сем'і, дзеці-сіроты, але сярод заселеных не аказалася ветэранаў вайны.

— А ў нас усе ўдзельнікі вайны забяспечаны жыллём, — адзначыў **Андрэй Сямашка, які ўзначальвае жыллёвы аддзел Баранавіцкага гарвыканкама.** Атрымліваецца, што праблема з жыллём для франтавікоў у горадзе вырашана, хоць яна заўсёды была набалелай.

А што здарылася ў Расіі? Там была прынята пастанова: да 2012 года ўсіх удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны забяспечыць жыллём — выдзеліць асобныя кватэры. Але планы правалiліся па адной вельмі простай прычыне. Як толькі стала вядома, што ўсе ветэраны вайны, якія не маюць жылля, будуць ім забяспечаны, іх колькасць вырасла ў разы.

Каб разабрацца глыбей у праблеме, вернемся ў былы Саюз. У той перыяд франтавікам кватэры давалі, але, як ні парадаксальна, чэргі на жыллё меншымі не станавіліся. А праблема аказалася завязанай на чалавечым фактары, які ў жыцці адыгрывае вялікую ролю.

У свой час я быў знаёмы з франтавіком, які ў 17 гадоў трапіў на фронт, быў паранены, а пасля вайны закончыў вячэрнюю школу, інстытут і працаваў канструктарам. А калі жаніўся, то як франтавік атрымаў кватэру. Праз некалькі гадоў Мікалай Іванавіч развёўся, а кватэру пакінуў жонцы з сынам. Пайшоў працаваць на іншае прадпрыемства, і там, зноў жа, як франтавіку, яму выдзелілі кватэру, але на гэты раз аднапакаёвую. Жаніўся на маладой, якая неўзабаве яго выгнала. І памёр франтавік у інтэрнаце. Чалавек па натуры добры, але бязладны. А ёсць жа чыстыя прагматыкі.

Адзін удзельнік вайны здолеў пашырыць траім сваім дзецям жылплошчы. Жыў з дачкой, і таму ім далі новую кватэру. Затым ветэран падаўся ў іншы горад да сына і там стаў на льготную чаргу, а затым паехаў да іншага сына...

Сацыяльнае жыллё — гэта бадай што адзіны спосаб навесці ў гэтым пытанні парадак. Тым не менш, нават сацыяльнае жыллё часам спрабуюць нейкім чынам атрымаць ва ўласнасць.

Мне давялося прысутнічаць на адным прыёме, які праводзіў сталічны чыноўнік высокага рангу.

Наведвальнікаў было шмат, але, найперш, запомніўся ўдзельнік вайны.

— Я кроў праліваў, а жыць няма дзе, — абураўся пенсіянер і нікога не хацеў слухаць. Вядома ж, што і скаргі адсылаліся ў розныя інстанцыі. Але, выказваючы сваю крыўду, чалавек не гаварыў усю праўду, а рабіў націск на самы балючы момант — мясцовая ўлада крыўдзіць франтавіка.

Дачка пенсіянера прадала трохпакаёвую кватэру і перасялілася з сям'ёй да бацькі ў прыватны дом, які і быў перапісаны на дачку. Вось так франтавік афіцыйна застаўся без жылля і стаў патрабаваць кватэру. Самае цікавае, што нават у такой сітуацыі яму далі сацыяльнае жыллё, але ўсяляцца ў кватэру пенсіянер адмовіўся.

На тым прыёме пасля чарговага эмацыянальнага ўсплёску пенсіянер пагадзіўся засяляцца ў сацыяльную кватэру, але пры ўмове, што ўнучка будзе прапісана разам з ім. Пенсіянеру пачалі тлумачыць, што такі варыянт немагчымы, бо жыллё сацыяльнае, але той настойваў на сваім.

Не ведаю, ці засяліўся былы франтавік, але ўсе гэтыя сцэны пакідаюць непрыемнае ўражанне...

Без сумнення, людзі заслугоўваюць павагі (а як інакш?), але радня падштурхоўвае... Дзеці і ўнукі імкнуцца з дапамогай бацькі ці дзеда нешта атрымаць ад дзяржавы. Яны вераць у магчымасць нешта ўхапіць для сябе. Маўляў, калі праявіць настойлівасць — улада праігнаруе закон.

Нялёгка выслухоўваць іншым разам пенсіянера, які не ўспрымае ніякіх аргументаў і законаў, але ўлада, лічу, павінна займаць цвёрдую пазіцыю. У Баранавіцкім раёне ўдзельнікі вайны таксама забяспечаны жыллём. Як правіла, яны жывуць у прыватных дамах, і толькі адзін пенсіянер меў сацыяльную кватэру ў пасёлку Жамчужным. Франтавік памёр, і цяпер там жыве яго жонка.

Будаўніцтва сацыяльнага жылля паказала, што своечасова прыняты закон спрыяе вырашэнню, здавалася б, самай балючай праблемы.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Факт

## 20 гадоў святу духоўнай музыкі

**Віцебскае штогадовае «Свята духоўнай музыкі» смела можна назваць унікальным, бо ў наступным годзе яму споўніцца 20 гадоў. А сёлета яно прайшло ўжо ў 19-ы раз.**

Свята пачалі праводзіць яшчэ ў 90-я гады мінулага стагоддзя, калі духоўнасці так не хапала, а многія толькі пачалі вяртацца да Бога. Па добрай традыцыі, эпіцэнтрам падзей стаў Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа. Тут у ліку іншых «неслі» мастацтва гледачам камерны хор Цэнтра культуры «Віцебск», царкоўныя хоры, хор ветэранаў «Надзея», хор Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава і іншыя калектывы і выканаўцы.

На другі дзень свята выступленні адбыліся ў ніжнім храме аднаўленага Свята-Успенскага кафедральнага сабора. Цікава, што выступіць тут запрасілі і харавы калектыў з-за мяжы — «Даўгава» Цэнтра латышскай культуры Даўгаўпілса.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Добрыя справы

# ГЛЫБОКАЕ СТАНЕ... СТАЛІЦАЙ



**Старшыня Глыбоцкага райвыканкама Алег Морхат разам са сваімі падначаленымі нечакана для землякоў стаў Дзедам Марозам. Адказныя асобы за ўласныя грошы куплялі падарункі для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, сірот, малых са шматдзетных сем'яў і асабіста іх уручалі. Лісты са сваімі пажаданнямі дзеці загадзя вешалі на ёлку, устаноўленую ў будынку райвыканкама.**

***— Дык да каго першага, Алег Віктаравіч, прыйшла ідэя перад навагоднім святам выконваць мары дзяцей? — цікаўлюся ў старшыні райвыканкама.***

— Калі напішаце, што гэта калектыўная ідэя, не памыліцеся.

А падарылі дзецям цацкі, садавіну, розную салодкую прадукцыю. Цікава, што сярод жаданых падарункаў быў нават электрычны чайнік. Работнікі райвыканкама куплялі падарункі і «пад кіраўніцтвам» Дзеда Мароза і Снягуркі наведвалі дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльным прытулку і бальніцы, выхоўваюцца ў доме сямейнага тыпу і ў мнагадзетных сем'ях... Калі прыходзілі з падарункамі ў дамы, у той жа прытулак, мелі магчымасць знаёміцца з умовамі жыцця, выслухоўваць пытанні, якія трэба вырашаць уладам.

Мы ганарымся тым, што нашы дзеці ў лідарах па колькасці пераможцаў алімпіяд пасля Віцебска, Наваполацка і Оршы. 78 працэнтаў выпускнікоў паступілі ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя ўстановы, а гэта першае месца ў вобласці. Да таго ж, у нас самы лепшы на Віцебшчыне паказчык па замацаванні кадраў — у раёне застаецца 90 працэнтаў маладых спецыялістаў...

Расказваючы пра падрыхтоўку Глыбоцкага раёна да Дня беларускага пісьменства, старшыня райвыканкама ўзгадаў, што, аказваецца, і ў Казахстане ёсць горад Глыбокае, і ва Украіне. Так з'явілася ідэя сябраваць, стаць гарадамі-пабрацімамі. І запрасіць «цёзак» на свята.

— Мы ўжо даўно да яго рыхтуемся. У прыватнасці, уязныя знакі памянялі, прыдарожныя палосы прывялі ў парадак. Людзей па-добраму «завялі» тым, што Глыбокае хоць на час стане «сталіцай». Часу застаецца мала. Чакаем фінансавання для падрыхтоўкі, але і самі зарабляем і прыцягваем сродкі. Суботнікі, дапамога спонсараў, прадпрыемстваў — усё гэта папаўняе і папоўніць фонд будучага свята. Ёсць планы пабудаваць капліцу, вядзецца рамонт раённага дома культуры, распачалі будаўніцтва амфітэатра. Актыўна займаемся добраўпарадкаваннем — горад прыгажэе на вачах. І добра, што захаваліся да нашых дзён два прыгожых храмы: праваслаўны і каталіцкі. Не ў кожным горадзе такую прыгажосць убачыш.

Вядома, і ведамствы стараюцца дапамагчы гораду. Напрыклад, «Віцебскаблсаюздрук» адрамантаваў адміністрацыйны будынак, а да свята замест існуючых кіёскаў будуць устаноўлены чатыры гандлёвыя павільёны.

...Пазней на свае вочы ўбачыў, як ствараецца ў самым цэнтры горада парк адпачынку — на беразе возера і дзвюх рэчак. Частка парку месціцца літаральна на былым балоце, якое пачысцілі. Тут зробяць пешаходную і веласіпедную дарожкі.

Словам, Глыбокае збіраецца сустрэць гасцей ва ўсёй сваёй прыгажосці. Свята пройдзе, а прыгажосць, як той казаў, застанецца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Ну і ну!

## ДЗЯЎЧЫНА ЗЛАМАЛА... СВЯТЛАФОР

**На Каляды ў Гродзенскай вобласці, на шчасце, не зарэгістравана выпадкаў траўматызму людзей у аўтааварыях. А вось святлафору на кальцавой развязцы па вуліцы Дзяржынскага ў абласным цэнтры дасталася даволі моцна. І ад каго? Ад дваццацігадовай дзяўчыны, паведамляе Гродзенская абласная Дзяржаўтаінспекцыя.**

А пятай гадзіне раніцы жыхарка Бераставіцы, аб'язджаючы «Мерседэс» на сваім «Фальксвагене», вырашыла перастроіцца з правага рада ў левы. Аднак тармажэнне закончылася заносам аўтамабіля на раздзяляльную паласу, дзе ён урэзаўся ў святлафор. А неўзабаве высветлілася, што ўтрыманне алкаголю ў арганізме вінаўніцы здарэння, якая толькі ў мі мінулага года атрымала пасведчанне кіроўцы, перавысіла 1,6 праміле. І гэта, нагадаем, пры дапушчальнай норме 0,3 праміле.

Дзяўчына патлумачыла свой стан тым, што ўвечары ўжывала спіртное. Праўда, у які час канкрэтна і ў якой колькасці, яна не памятае.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## КІТ ЗАСТАЎСЯ БЕЗ СВЯТЛА

Невядомы абрабавалі на навагодніх дні... кіта. З малой архітэктурнай формы, размешчанай у Гомелі каля праспекта Касманаўтаў, выкрадзена спецыяльнае светлавое абсталяванне на суму больш за Br1 млн рублёў. Тры металічныя інфармацыйныя знакі былі зняты з абочыны аўтадарогі Светлагорск—Жлобін каля вёскі Дуброва Жлобінскага раёна. Між тым, два тыдні таму ў гэтым жа месяцы адбылося аналагічнае злачынства, якое пакуль што не раскрыта. Страты заказніка рэспубліканскага значэння «Выдрыца», якому належыць маёмасць, складаюць каля Br3 млн. Заведзена крымінальная справа і па факце крадзяжу ў Гомелі з фасада будынка аддзялення банка трох святлодыёдных гірляндаў, якія каштуюць больш за Br3 млн.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## НЕПРАЦУЮЧАМУ СПАТРЭБІЛІСЯ ІНСТРУМЕНТЫ...

У аддзяленне міліцыі гарадскога пасёлка Багушэўск Сенненскага раёна звярнуўся кіраўнік фермерскай гаспадаркі і паведаміў, што ноччу нехта знайшоў пакінуты ў загадзя вызначаным месцы ключ ад сталярнай майстэрні, размешчанай на тэрыторыі гэтай гаспадаркі, і здзейсніў крадзеж электраінструментаў. Шкода нанесена на суму 2,7 мільёна рублёў. Супрацоўнікамі міліцыі было ўстаноўлена, што пайшоў на злачынства непрацуючы жыхар вёскі Балбасава 1983 года нараджэння. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПРАЙШЛІ ПРАЗ СЦЯНУ...

У гараж, які знаходзіцца ў Пінску па вул. Фядотава, зладзеі залезлі, не закрануўшы замкоў. Праламалі сцяну і выкралі 3 «балгаркі», 2 паркетныя пілы, перфаратар, электрапомпу і іншую тэхніку. А яшчэ прыхапілі 20 бутэлек алкагольных напояў і 60 літраў саляркі...

Чалавек панёс страты на 8,5 млн рублёў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ**
**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 18 января 2012 года**
**проводит 16-ый и 18-ый повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности на 1-ом открытом аукционе**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 145 | Грузовой КамАЗ-4310, ш. 0029435, дв. 0056962, 3 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1986 | 99 525 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 169 | Грузовой Урал-43202 ш. 143769, дв. 577687, 3 кат. | н.п. Деревная, Барановичский р-н 230 ОВП | 1989 | 106 594 | 18 000 000 | 1 800 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, каб. № 637 **18 января 2012 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы **до 16.00 13 января 2012 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **18 января 2012 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

Усходні гараскоп на тыдзень

# Творчы патэнцыял Вадалееў будзе на вышыні, а Скарпіёны змогуць праявіць сябе ў якасці лідара

**АВЕН**. Назапашаныя сілы спатрэбяцца для інтэнсіўнай і плённай працы, толькі ўзвальвайце на сябе нагрузку, хоць колькі-небудзь суадносячы яе са сваімі магчымасцямі. Сіл, можа, і хопіць, але часу ў сутках больш не стане. Абвостраная праніклівасць будзе спрыяць дзеламу і прафесійнаму поспеху. Не здавайцеся пры першых цяжкасцях. Цяпер важна праявіць ветлівасць і настойлівасць: менавіта гэтая тактыка — ключ да дасягнення мэты.

**ЦЯЛЕЦ**. Будзеце мець шмат зносін і атрымліваць карысную інфармацыю. Зоркі кажуць, што вы можаце ўбачыць свет па-новаму і адрадзіць некаторыя старыя ідэі, злёгку падкарэктаваўшы іх. Сям'я і сябры, хутчэй за ўсё, наўрад ці ацэняць належным чынам нядаўнія дасягненні, затое іх спрыяльны эфект адчуюць усе навокал.

**БЛІЗНЯТЫ**. Праявіце настойлівасць і актыўнасць у справах, асабліва — у навучанні, калі вырашыце ім заняцца. Яно, дарэчы, будзе вельмі паспяховым і абяцае прынесці немалую карысць. Час падыходзіць для пошуку новай працы і змены дзейнасці.

**РАК**. Будзеце прыцягваць навакольных дабрынёй, мудрасцю і шчырым жаданнем прыйсці на дапамогу ў цяжкую хвіліну. Інтуіцыя дапаможа вам апынуцца на вышыні і нават дапамагчы ў цяжкай сітуацыі калегам.

**ЛЕЎ**. Час хоць бы злёгку абнавіць свой імідж, бо гэтая змена будзе спрыяць прасоўванню па кар'ернай лесвіцы. Сканцэнтруйце ўвагу на працы: магчыма раптоўнае павелічэнне нагрузкі, з'яўленне новых абавязкаў. Смела можаце праяўляць творчы бок сваёй натуры, што дапаможа ўвасобіць у жыццё самыя неардынарныя задумы.

**ДЗЕВА**. Вакол вас паўстане насычанае інфармацыйнае поле, і вы ледзь зможаце ўспрыняць новыя звесткі, якія паступаюць з усіх бакоў. Ад аб'ёму выкананай працы будзе залежаць узнагароджанне, якое вы атрымаеце. Аднак не забывайцеся пра адпачынак і не працуйце на шкоду здароўю.

**ШАЛІ**. Вы можаце выклікаць у навакольных неадназначныя ацэнкі. Пастаўцеся да гэтага спакойна і абыякава. Сваёй упэўненасцю вы толькі павысіце павагу да сябе і ўмацуеце свой аўтарытэт. Ваша актыўнасць і ініцыятыва дапамогуць справіцца з перашкодамі, якія ўзнікаюць. Важным момантам з'явіцца тое, што сілы лепш накіраваць на найважнейшую мэту, а не растрачваць па дробязях.

**СКАРПІЁН**. Вы нарэшце адчуеце сілу для новых здзяйсненняў, гэта дазволіць прыняць удзел у рознапланавых праектах і вырашыць самыя незвычайныя пытанні, пра якія вы нават і думаць раней не маглі. Мноства ідэй дапаможа праявіць сябе ў якасці лідара, заадно раскрыўшы арганізатарскія здольнасці. Тыдзень будзе насычаны паездкамі і сустрэчамі.

**СТРАЛЕЦ**. Асабліва ўдалы час для рэалізацыі дзелавых ідэй. Уласны прэстыж і рэпутацыя цалкам у вашых руках. Лепш за ўсё засяродзіцца на доўгатэрміновых планах. Можаце смела глядзець у будучыню, дэманстраваць свае погляды і выказваць меркаванні: вашы словы і дзеянні толькі ўмацуюць аўтарытэт.

**КАЗЯРОГ**. Працягвайце аналізаваць сітуацыю, якая склалася, і ўвасабляць свае планы ў жыццё. Прыводзьце ў парадак усё, да чаго дацягнецеся. У тым ліку і ўласныя думкі. Гэта дапаможа праліць святло на прычыны таго, што адбываецца. Каб пазбегнуць магчымых непрыемнасцяў, паспрабуйце сабрацца і супакоіцца.

**ВАДАЛЕЙ**. Тыдзень будзе вельмі ўдалы, нягледзячы на некаторую аднастайнасць і руціннную працу. Калі вы ў сваіх планах улічыце інтарэсы дзелавога партнёра, то ад гэтага толькі выйграеце: гэта, дарэчы, будзе спрыяць умацаванню аўтарытэта і ўплывовасці. Цяпер у вас вельмі высокі творчы патэнцыял.

**РЫБЫ**. Усе вашы таемныя задумы могуць рэалізавацца, таму праявіце адначасова мудрасць і прадпрымальнасць. У панядзелак важна з'явіцца перад публікай ва ўсёй красе і блеснуць сваімі новымі ўменнямі. Пажадана пры гэтым, каб вас заўважыла і ацаніла па заслугах начальства.

# «ЗВЯЗДА» — МАЙСТРАМ ДАРАДЧЫЦА










**У бібліятэцы каледжа. Навучэнцы Дзяніс Паспелаў і Андрэй Карповіч будуць мулярамі-мантажнікамі.**

**Насця Кавалеўская яшчэ толькі пачала авалодваць прафесіяй, але спадзяецца, што неўзабаве зробіць прыгожыя саламяныя пацеркі.**

**У музеі каледжа сабраны лепшыя ўзоры работ маладых майстроў.**

«Прыходзьце да нас у госці, паглядзіце, як вучацца будучыя майстры!» — такое запрашэнне я атрымаў днямі ад навучэнцаў Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя М. Кедышкі, з якімі пазнаёміўся на літаратурнай вечарыне ў бібліятэцы. Вясёлая чародка юнакоў запэўніла, што газету «Звязда» навучэнцы і выкладчыкі штодзень бачаць у сваёй бібліятэцы і нярэдка чытаюць яе з нагоды сваёй прафесійнай зацікаўленасці. У чым гэтая зацікаўленасць, я здагадаўся з першых хвілін знаходжання ў сценах каледжа. Менавіта гэтыя ўпрыгожаныя сцены яскравей за любыя шыльды сведчылі: тут вучацца людзі таленавітыя, здольныя сваімі мастацкімі творамі аформіць інтэр'ер на высокім дызайнерскім узроўні. У студэнцкай бібліятэцы мае здагадкі пацвердзіла загадчыца Зоя Дрыжынская:

**Вучнёўская калекцыя велікодных сувеніраў — драўляныя, інкруставаныя саломай і шпонай яйкі.**

— Газета «Звязда» часта расказвае пра народнае мастацтва розных рэгіёнаў Беларусі. Амаль што ў кожным нумары нешта паведамляюць пра майстроў дэкаратыўна-прыкладной галіны, ёсць здымкі іх вырабаў. Усё гэта — вельмі каштоўная інфармацыя для нашых навучэнцаў. Падручнікі, зразумела, патрэбныя, але такі аператыўны вучэбны матэрыял нічым іншым не заменіш! Шмат карыснага навучэнцы знаходзяць для сябе і ў гэтых выданнях, — мая субяседніца кладзе побач з падшыўкай «Звязды» стос кніжак выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя», прысвечаных тэмам, якія цікавяць будучых майстроў.

Адразу заўважу, што не ў кожнай навучальнай установе сёння набываюць для чытачоў такі шырокі, прадумана складзены камплект навінак айчыннай кнігі і перыёдыкі. Залежыць гэта не столькі ад фінансавага становішча, колькі ад разумення таго, што будучыя майстры ў сваёй вучобе не абмяжоўваюцца толькі тэорыяй — яны павінны бачыць штодзённую творчасць прызнаных мастакоў, вывучаць яе.

У бібліятэчнай зале, прасторнай і ўтульнай, побач з кнігамі і перыёдыкай размешчаны цудоўныя вучнёўскія вырабы з саломкі, лазы, керамікі, інкруставаныя пано. Адну сцяну ўпрыгожваюць зробленыя ў старажытнай манеры выявы святых асветнікаў Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, першадрукара Францыска Скарыны. Насупраць — калекцыя лакавых мініяцюр, намаляваных на дрэве, партрэты беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Усё разам — своеасаблівая экспазіцыя, дзе ёсць месца мінуламу і сучаснасці.

Пра такую повязь часоў распавёў у сваім невялікім інтэрв'ю для нашай газеты дырэктар каледжа Андрэй Саюк. Сімвалічна, што гэтая навучальная ўстанова носіць імя Героя Савецкага Саюза Мікалая Кедышкі — члена мінскага падполля, дзе ў гады вайны выходзіла газета «Звязда». Дарэчы, сам Мікалай Кедышка да вайны займаўся ў школе фабрычна-заводскага навучання, з якой потым і вырас цяперашні каледж.

Сёння тут навучаецца больш за 800 чалавек, гэта буйная навучальная ўстанова, якая аб'яднала гарадское прафтэхвучылішча № 24 будаўнікоў і навучальна-прафесійны Цэнтр дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Тут рыхтуюць цесляроў і сталяроў, абліцоўшчыкаў і маляроў, плітачнікаў і электразваршчыкаў, мастакоў роспісу па дрэве, керамістаў, майстроў лозапляцення, выканаўцаў мастацка-афарміцельскіх работ... Доўгі пералік спецыяльнасцяў нядаўна пашырыўся: тут пачалі рыхтаваць кавалёў.

Па словах дырэктара, за каледжам замацаваны базавыя прадпрыемствы, куды трапляюць на працу выпускнікі будаўнічага аддзялення. Гэта ААТ «МАПІД», будаўнічы трэст №7 — калектывы, вядомыя ўдзелам ва ўзвядзенні самых знакавых аб'ектаў Мінска. Попыт на выпускнікоў каледжа вялікі. Шкада толькі, што запланаваную колькасць навучэнцаў з кожным годам набраць усё цяжэй. Хаця праблема арыентацыі на рабочыя прафесіі распаўсюджваецца далёка па-за сценамі гэтай навучальнай установы, педагогі і майстры бачаць у тым ліку адказнымі за становішча і сябе саміх. Тут узялі курс на інтэграцыю некалькіх спецыяльнасцяў у адну кваліфікацыю — цяпер абітурыенты будуць больш зацікаўленымі, бо адначасова атрымаюць розныя (запатрабаваныя!) прафесіі, якія пры гэтым яшчэ і добра аплачваюцца.

Будзем спадзявацца, што гэты нумар «Звязды» данясе нашым чытачам з розных рэгіёнаў краіны інфармацыю пра каледж, дзе маладыя таленты вучацца будаваць дамы і ўпрыгожваць інтэр'еры. Калі сярод сёлетніх абітурыентаў стане больш тых, хто зрабіў свой выбар дзякуючы нашай газеце — «Звязда» яшчэ раз пацвердзіць, што яна для майстроў заўжды з'яўляецца добрай дарадчыцай.

**Яўген ПЯСЕЦКІ,**
**Фота аўтара.**




**Майстар вытворчага навучання Наталля Блахіна пазнаёміла нас з тым, як у час заняткаў звычайныя матэрыялы пераўтвараюцца ў маляўнічыя вырабы.**

# ТВОРЧЫЯ ГЕНЫ ШАСТАБАЕВЫХ



**Галава сям'і Леанід Якаўлевіч ШАСТАБАЕЎ — вясковы гарманіст па жыцці.**

**Напэўна, усё ж няпраўду кажуць пра нашчадкаў таленавітых людзей, што прырода адпачывае на наступных пакаленнях. Зусім не факт. У сям'і Шастабаевых, якія жывуць у аграгарадку Баравіца Кіраўскага раёна, ёсць мастакі, музыкі, майстры па дрэве і ўвогуле ўмельцы на ўсе рукі.**

**Галава сям'і, 83-гадовы Леанід Якаўлевіч ШАСТАБАЕЎ — цясляр па прафесіі і вясковы гарманіст па жыцці. Творчымі здольнасцямі, атрыманымі ў спадчыну, ганарацца яго дзеці і ўнукі.**

## ВЯСКОВЫ САМАРОДАК

Гэтая хата ў Баравіцы пафарбавана ў жыццярадасныя колеры і аздоблена разьбой па дрэве. Гаспадар, хоць і вельмі паважанага ўзросту, але па-маладому любіць яркасць. Каляровыя фіранкі і пасцілкі, і нават вялікі абраз Божай Маці, намаляваны сынам, вызначаюцца насычанымі фарбамі.

Але самая вялікае ўражанне робяць гармонікі, выстаўленыя на агляд на канапе — лепшыя з калекцыі Леаніда Шастабаева. Яны прыгожыя і нібыта цацачныя.

У кожнага гармоніка — свая гісторыя.

— Вось гэты трапіў у мае рукі ў 1970-ыя, я аддаў за яго суседу-музыку дзесяць савецкіх рублёў, і гэта былі не такія ўжо малыя грошы, — расказвае Леанід Якаўлевіч.

Гармонік быў пабіты і няспраўны, давялося доўга яго рамантаваць.

— Усё рабіў сам, — горды гаспадар разбірае гармонік на часткі і дэталёва тлумачыць іх прызначэнне. — Кнопкі выразаў з плексігласу і падкладаў фарбу. Рабіў складаныя люстэркавыя ўстаўкі. Пластмасавы «перламутр» даставаў у знаёмага музыканта з Бабруйска. Прыдумляў, каб было прыгожа.

У яго руках старыя інструменты набывалі голас і лоск. Дарэчы, асобныя дэталі гармоніка нагадваюць пра актуальныя навагоднія святы, таму што ў празрыстым акенцы іскрыцца ёлачны «дожджык», а з іншага боку зроблена ілюмінацыя з гірлянды на батарэйцы. Усё, каб стварыць святочны настрой — сабе і слухачам.

— Самае цікавае, што ноты я не ведаю, хоць усё жыццё і граю на гармоніку, — смяецца Шастабаеў. — Няма ў мяне ніякай музычнай адукацыі, я самавук. Глядзеў, падпяваў старадаўнія мелодыі, так і захапіўся музыкай. Нават сам напісаў некалькі песень, усе пра шчаслівае каханне.

## 100-ПРАЦЭНТНАЯ СЯМ'Я

Ніхто не ведае, адкуль у Шастабаевых каштоўныя творчыя гены: бацька Леаніда Якаўлевіча быў простым селянінам, але адзін з яго сыноў стаў мастаком, а другі — музыкант, хоць і самадзейным.

— Мы, можа, і не самыя адукаваныя людзі, але працавітыя, цалкам прыстойныя і майстравыя, — гаворыць ён.

У гэтага старога чалавека ўсё яшчэ ясны позірк, цвярозы розум і добрая памяць. Ён расказвае, як загінулі на фронце два браты, напрыканцы вайны. А сам ён за тым часам зарабляў на крупы і яйкі продажам расчосак: падлетак сам рабіў іх з бляшанак, якія здымаў з нямецкага самалёта, што ўпаў у лесе паблізу вёскі. А потым у рукі трапіў нямецкі губны гармонік, і разам з суседам-балалаечнікам яны сталі самымі пажаданымі гасцямі на любых вячорках і святах.

— Гарманіст — гэта ж дадатковы заробак. Музыка прыносіла грошы, і гэта было вельмі важна для маёй сям'і.

На рэдкім вяселлі ў акрузе не граў Леанід Шастабаеў, але яго ўласнае вяселле было ў пасляваеннай вёсцы даволі бедным. Малады чалавек ажаніўся ў 20 гадоў, але ўсё жыццё, як і цяпер узгадвае мужчына, «ён і яго любая Ірына любаваліся адно на аднаго».

— Я ніколі без пацалунка не ішоў на працу. Наша сям'я была добрая, на ўсе 100 працэнтаў. У нас нарадзілася 6 дзяцей. Цяпер ёсць 12 унукаў і 4 праўнукі. Праўда, зараз я жыву адзін, ужо больш за дзясятак гадоў, і захоўваю ў душы светлыя ўспаміны...

Ён 47 гадоў адпрацаваў цесляром у калгасе і нездарма называе сябе працаголікам. «Я люблю жыццё мірнае і працоўнае», — гаворыць стары Шастабаеў і паказвае, што ён сам зрабіў з сынамі сваю хату і ўсё ў ёй таксама: ад ложка да печкі.

## «БАМБІЦЬ» ГАРМАНІСТ

Шастабаевы — стараверы. Асноўныя традыцыі гэтых вернікаў, якія здаўна жывуць у некалькіх вёсках на Кіраўшчыне, перадаюцца з пакалення ў пакаленне: акрамя рэлігійных, ёсць і цалкам жыццёвыя. Напрыклад, мера ва ўсім: Леанід, хоць і граў на вяселлях, як ні дзіўна — сам толькі адзін раз мог чарку падняць за здароўе маладых. Не болей.

— У мяне быў такі дэвіз: «скласці» вяселле, граць да поўнай перамогі, — смяецца вопытны гарманіст. — Я сваіх сіл ніколі не шкадаваў. На тры дні наймаюць — ну і буду «бамбіць». На добрым вяселлі трэба, каб усе нагуляліся і натанцаваліся. Таму і ўначы граў, і да раніцы, але не здаваўся.

На сцяне — стары фотаздымак у рамцы. Збоку наіўны дзіцячы малюнак з ружамі і гарманіст савецкага перыяду, у строі з гальштукам. Цяпер на Леанідзе Якаўлевічы — новая кашуля ў актуальную клетку, і па тым жа самым гармоніку спрытна бегаюць пальцы. І хоць гарманіст скардзіцца звыкла, што «ўжо не тое», але падаецца, што і цяпер можна на вяселле ды ў танец!

— Я не думаю, што гармонік калі-небудзь зусім сыдзе з жыцця сялянства, — разважае Шастабаеў. — Таму што гэта нібыта першапачатковая музыка. Праўда, сёння часам здаецца, што тэхніка ўсё перасіліла, але калі на гулянцы возьмеш гармонік ды зайграеш — пад такую музыку яшчэ лепей ідуць танцаваць. Таму што ўсё гэта жывое! Проста мы, гарманісты, ужо сыходзім, гэта так.

У калекцыі Леаніда Шастабаева — больш за дзясятак старых гармонікаў. Нават няспраўныя ён усё роўна захоўвае: у надзеі на тое, што яны яшчэ спатрэбяцца нашчадкам.

— Усе дзеці прайшлі праз нашы з жонкай рукі, — гаворыць пенсіянер. — Дзеці прасілі альбо дапамагчы з грашыма на кватэры, альбо даглядаць дзяцей, калі яны працуюць. Заробкі ў нас былі малыя, таму мы бралі да сябе ўнукаў, выхоўвалі. І ўсе яны выраслі добрымі людзьмі.

## ДЫНАСТЫЯ З БАРАВІЦЫ

Унучка Леаніда Якаўлевіча, **19-гадовая прыгажуня Ганна ШАСТАБАЕВА**, жыве паблізу ад дзеда і вучыцца ў Бабруйскім мастацкім каледжы. Яшчэ ў дзяцінстве яна зразумела, што мае мастацкія здольнасці, і вырашыла абавязкова іх скарыстаць. Дзяўчына будзе займацца роспісам па дрэве, а пакуль ахвотна паказвае свае карціны: прыгожыя коні з шаўковымі грывамі і гусакі, якія нечакана пасвяцца ў цюльпанах.

— Я мяркую, што ва ўсе часы будуць цаніцца ручная праца і арыгінальныя карціны, — разважае маладая мастачка. — Такая праца даходная і перспектыўная, на мой погляд. Нават можна проста маляваць партрэты, бо многія людзі просяць. Рэпрадукцыі і друкаваныя фота — гэта адно, а жывая індывідуальная работа — гэта ўжо зусім іншае.

Калі Ганна — гламурная бландзінка, то **яе малодшая сястра Лізавета** абрала цёмны колер валасоў і стыль лёгкай «готыкі». Яна пакуль больш захоплена сацыяльнымі сеткамі ў інтэрнэце, але таксама малюе.

— Мы пойдзем па слядах дзеда і бацькі, — гаворыць Ганна. — Вось толькі да генаў трэба яшчэ дадаць любоў да працы, інакш і ў творчасці нічога не атрымаецца.

**Бацька дзяўчат, Міхаіл Леанідавіч ШАСТАБАЕЎ**, у свае 43 гады — гаспадар прыгожага вясковага дома, поўнага незвычайных рэчаў. На двары стаіць каменны мішка, дарагі сэрцу кожнага савецкага чалавека сімвал Алімпіяды-80. Для Міхаіла Леанідавіча гэта яшчэ і напамін пра гады маладосці ў мастацкай вучэльні ў Бабруйску, дзе была і апрацоўка камянёў. Гэты мішка ўжо пакрыўся зялёным мохам, пасля рук чалавека яго абчасалі гады і прырода, а таму ён больш падобны на нейкага каменнага ідала, «Міхайлу-продка».

Пальмамі, выкананымі з пластыкавых бутэлек, сёння беларускую вясковую грамадскасць наўрад ці можна здзівіць. Але ў Шастабаевых на пальме «растуць» яшчэ і яркажоўтыя бананы. Рукамі не чапаць: за парадкам пільна сочаць мопсы, любімцы дзяўчат і проста вельмі цікаўныя істоты. У пакоях — эклектыка з кітайскіх, японскіх і афрыканскіх сувеніраў. У сенцах — рогі і драўляная галава каўказскага тура. Міхаіл, які мае спецыяльнасць рэзчыка па дрэве, паказвае свае вырабы: ад аздаблення гукавых калонак да рэстаўраванай старой шафы.

— Было натхненне, і я рабіў, маляваў, ствараў, — кажа Міхаіл. — Я, вядома, не самы вялікі мастак, але хацелася ўпрыгожыць сваё жыццё.

Мужчына гаворыць, што цяпер, калі жыццё захапілі камп'ютары і ўвогуле самыя розныя механізмы, якія спрашчаюць жыццё чалавека, важна рабіць нешта менавіта сваімі рукамі.

— Гэта ўсё, безумоўна, пайшло ад бацькі, — гаворыць Міхаіл. — Ён свае таленты нібыта падзяліў на нас, усіх сваіх дзяцей. Хто захапляецца музыкай, хто маляваннем, хто дрэвам. Пры гэтым бацька ніколі не цісnуў на нас, тут проста творчыя гены Шастабаевых спрацавалі, і мы гэтым ганарымся.

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.**
*Кіраўскі раён.*



**Міхаіл ШАСТАБАЕЎ – гаспадар прыгожага дома ў аграгарадку Баравіца: «Бацька свае таленты нібыта падзяліў на нас, усіх сваіх дзяцей».**



**Маладая мастачка Ганна ШАСТАБАЕВА нераўнадушная да гусакоў у цюльпанах.**

Аляксандр РЫБАК:

«Еўрафэст-2012»



**Знакаміты спявак задаволены падрыхтоўкай беларусаў да «Еўрабачання», аднак параіў канкурсантам падцягнуць англійскую мову**

# «Я НЕ ЛІЧУ, ШТО Ў ЕЎРОПЕ ЁСЦЬ ІНШЫЯ АРЭНЫ,

## дзе можна здабыць такую ж славу, як на «Еўрабачанні»

**Знакаміты нарвежскі спявак беларускага паходжання, пераможца «Еўрабачання-2009» Аляксандр Рыбак прыехаў у Беларусь па запрашэнні Белтэлерадыёкампаніі ў межах падрыхтоўкі да міжнароднага конкурсу «Еўрабачанне-2012».**

На прэс-канферэнцыі журналісты спрабавалі «выцягнуць» з Рыбака формулы і сакрэты поспеху на конкурсе, аднак спявак прызнаўся, што гэта непрадказальна:

— *У жыцці ніколі не атрымаецца ўсё так, як вы задумалі. Я для «Еўрабачання» напісаў баладу, а ў выніку ўсё змянілі і ў конкурсе я ўдзельнічаў зусім з іншай песняй. На жаль, я не магу даць рэцэпт перамогі. Артыст павінен быць падрыхтаваным, і, калі апынецца на сцэне, каб не пытаўся «чаму я тут?», а каб меў ужо сваю «гісторыю»...*

Аляксандр Рыбак лічыць, што галоўнае — ставіць за мэту не мару пра папулярнасць, а мару пра папулярызацыю сваёй музыкі:

— *Чаму на конкурсе апошнім часам адсутнічае арыгінальнасць у нумарах канкурсантаў? Таму што ўсе спрабуюць рабіць прагнозы замест таго, каб ісці за сэрцам і верыць у тую песню, якую спяваеш, а не думаць пра тое, што хочуць людзі.*

Спявак дадае, што многае залежыць і ад каманды артыста:

— *Праблемы ўзнікаюць і тады, калі ў канкурсанта вялікая каманда і ў камандзе ва ўсіх свае амбіцыі. За два дні перад эфірам яны пачынаюць спрачацца, і кожны трымаецца свайго. Не трэба забывацца, што ўсе вы — у адной лодцы.*

Аналізуючы песні пераможцаў «Еўрабачання» апошніх гадоў, Рыбак зазначае, што азербайджанцы адрозніваліся ад іншых песняй — «у іх быў такі амерыканскі рытм», а Лена — папулярным у той год «напалову джазам, напалову рокам».

Спявак прызнаўся, што яму вельмі сорамна, але беларускіх артыстаў і беларускія песні ён ведае вельмі мала.

— *Тое, што мне падабаецца ў эстрадных артыстах Беларусі, — гэта іх разняволенасць на сцэне. У Нарвегіі ўсё па-іншаму. Шоу амаль няма. Там мы проста з гітарай стаім і спяваем, а тут — тое, што мне падабаецца ва Усходняй Еўропе, — дазволена працаваць з сюжэтам, танцорамі. У Нарвегіі людзям такое чамусьці не падабаецца.*

**Чаму на конкурсе апошнім часам адсутнічае арыгінальнасць у нумарах канкурсантаў? Таму што ўсе спрабуюць рабіць прагнозы замест таго, каб ісці за сэрцам і верыць у тую песню, якую спяваеш, а не думаць пра тое, што хочуць людзі.»**

### У Гюнэш прыгожая ўсмешка, у «Litesound» — добрая англійская

На прэс-канферэнцыю з Рыбаком прыйшлі амаль усе фіналісты «Еўрафэста». Не было толькі дваіх: Алена Ланская не змагла перанесці канцэрт, а Юзары здаваў сесію.

Нарвежскі беларус пахваліў беларускі паўфінал, пашкадаваўшы, што не ўсе яго фаварыты прайшлі далей: песня гурта «THRILLER» зачапіла артыста.

Салістаў з «Litesound» Рыбак пахваліў за англійскую мову і за мелодыю песні, назваўшы яе «самай усходняй»: «Вас адразу палюбяць у Даніі і Швецыі». Вікторыі Алешцы спявак зрабіў камплімент за «чысты голас», а ў Гюнэш перапытаў, ці гэта сапраўднае яе імя.

— *Гюнэш, у цябе прыгожая ўсмешка: за тыя тры хвіліны ты ўсміхалася больш, чым я за ўсё сваё жыццё,* — **жартаваў Рыбак.** — *Не бойся ўсміхацца.*

Юзары Рыбак пахваліў за самаўпэўненасць і «брутальнасць»: маўляў, публіка гэта вельмі любіць. Найбольш каштоўны камплімент Аляксандр Рыбак зрабіў Алене Ланской.

— *Адчуваецца, што яна артыстка. Выступаючы, яна разумее кожнае слова, якое спявае. Песня вельмі добрая, голас шыкоўны.*

Падводзячы вынік, Рыбак сказаў, што ў нумарах беларусаў «шмат душы» і «дрэнная англійская мова». Спявак параіў канкурсантам больш часу праводзіць за праглядам англійскіх фільмаў.

На пытанне, ці трэба, каб беларусы спявалі на «Еўрабачанні» па-беларуску, Аляксандр адказаў проста, але трапна: «Калі песня на беларускай мове будзе перакананаўчай, калі на першым плане будзе музыка, то тады і мову ўсе адразу зразумеюць».

### Пра папулярнасць

— *Мне цяжка сказаць, папулярны я ці не,* — прызнаецца Рыбак. — *У мяне вельмі добрая каманда побач. Канцэртаў стала больш. У Амерыку я пакуль не хачу: куды больш я ўжо зрабіў у Еўропе. Зараз я гастралюю. Паралельна вучуся ў нарвежскай кансерваторыі на педагога і скрыпача.*

Пра свае далейшыя планы на «Еўрабачанне» Рыбак зазначае:

— *Я даўно ўжо вырашыў, што не буду больш стаяць на сцэне «Еўрабачання» як канкурсант. Але, мяркую, як кампазітар удзельнічаць буду яшчэ шмат разоў. Я не лічу, што ў Еўропе ёсць іншыя арэны, дзе можна здабыць такую ж славу, як на «Еўрабачанні». Стынг і Андрэа Бачэлі — тыя нямногія артысты з Еўропы, якія змаглі праславіцца без якогасьці конкурсу. На жаль, прадзюсараў такога ўзроўню, як у Амерыцы, у нас яшчэ няма. Таму для кожнага артыста конкурс «Еўрабачанне» — добрая магчымасць стаць вядомым у Еўропе.*

**Ілья ЛАПАТО.**

**Калі фінал «Еўрафэста»?**
**Фінал праекта пройдзе ў Палацы спорту 31 студзеня. Трансляцыя на тэлеканалах «Беларусь 1» і «Беларусь 24» запланавана на 19:00.**

# ГОРКІ ЎРОК

**20-годдзе распаду СССР**

**Канец мінулага года адзначыўся зыходам з жыцця адной з ключавых фігур сусветнай палітыкі апошняга дваццацігоддзя — апошняга прэзідэнта Чэхаславакіі і першага прэзідэнта Чэхіі Вацлава Гавела. У сувязі з яго смерцю заходнія мас-медыя пачалі сыпаць хвалебнымі некралогамі. Не толькі таму, што пра нябожчыкаў ці добра, ці нічога, але і таму, што для заходняга свету Гавел — фігура сапраўды адназначна станоўчая, адзін з сімвалаў трыумфальнай перамогі над СССР і сацыялістычным лагерам у «халоднай вайне».**

З усходу, з краін, якія ўзніклі на папялішчы СССР, фігура і дзейнасць Гавела ўспрымаюцца далёка не так адназначна. Гавел стаў адным з магільшчыкаў сацыялістычнай сістэмы, і калі ў вачах Захаду гэта быў сапраўдны трыумф, то для жыхароў былога СССР гэта абярнулася катастрафічнымі сацыяльнымі ўзрушэннямі, нестабільнасцю, стратай упэўненасці ў заўтрашнім дні. Вось чаму рукі неяк не падымаюцца апладзіраваць апосталу «аксамітнай рэвалюцыі», які сышоў. Светлы вобраз дысідэнта і барацьбіта з таталітарызмам азмрочваюць яго выказванні, якія апраўдвалі бамбардзіроўкі Югаславіі ў 1999 годзе. Па сутнасці, Гавел з'яўляецца суаўтарам сумна вядомага паняцця «гуманітарная інтэрвенцыя», які трывала ўвайшоў у палітычны слэнг.

Вацлаў Гавел — гэта сімвал паражэння савецкай сістэмы. Адначасова Гавел — гэта параджэнне фундаментальных недахопаў савецкай сістэмы, якія ў канчатковым выніку і загубілі яе. Вацлаў Гавел — гэта крах надзей на мірнае канструктыўнае рэфармаванне сацыялістычнага лагера, гэта горкі гістарычны ўрок.

Крах савецкай сістэмы быў абумоўлены не столькі славутай «неэфектыўнасцю», колькі памылковай, заганнай пастаноўкай мэт, якая асуджала СССР на заведама пройгрышную гонку з Захадам. Ідэалогія «спаборніцтва дзвюх сістэм» арыентавала СССР на канкурэнцыю «на роўных» з блокам найбольш развітых заходніх краін на чале з ЗША. Для такога спаборніцтва ў дзяржавы першапачаткова не было сіл і рэсурсаў. Сістэма працавала на знос і рана ці позна павінна была надарвацца. Той жа эфект спажывецкага рынку ў многім абумоўліваўся гэтай асаблівасцю савецкай сістэмы — забеспячэнне бытавога камфорту ўласных грамадзян знаходзілася на апошнім месцы пасля «гонкі ўзбраенняў», падтрымання сусветнага сацыялістычнага руху, фінансавання краін-сатэлітаў і іншых «глабальных задач», якія адцягвалі львіную долю вельмі заняпалых рэсурсаў СССР у супастаўленні з маштабам гэтых задач.

Якое магло быць выйсце з сітуацыі, што склалася? Уласна кажучы, такое выйсце вельмі няўмела і няўдала паспрабаваў знайсці Гарбачоў, хоць першапачатковы пасыл яго перабудовы быў слушным — «скідванне» празмерных знешнепалітычных абавязацельстваў, пераразмеркаванне рэсурсаў, якія вызваляюцца, на ўнутраныя патрэбы краіны, істотная лібералізацыя ўнутрыпалітычнай сітуацыі, глыбокая рэвізія ідэалогіі, адмова ад канфрантацыйнай рыторыкі і нармалізацыя адносін з Захадам, але пры захаванні агульнай «левай», сацыялістычнай скіраванасці афіцыйнай ідэалогіі.

Аднак апроч перабудовы, якая не ўдалася, былі і іншыя варыянты пераўтварэння сацыялістычнай сістэмы. Так, уключэнне ў зону геапалітычнага ўплыву СССР краін Усходняй Еўропы, у тым ліку Чэхаславакіі, стварала цудоўны палігон для адпрацоўкі альтэрнатыўных мадэляў сацыялістычнага будаўніцтва. Тэарэтычна менавіта ў краінах Усходняй Еўропы як буфернай зоны паміж СССР і Захадам маглі знайсці ўвасабленне тэорыі канвергенцыі, якія прадугледжвалі стварэнне грамадства, якое спалучае ў сабе найлепшыя рысы капіталізму і сацыялізму. У канчатковым выніку, такая канвергенцыя магла прывесці да выхаду з «халоднай вайны» без настолькі разбуральных наступстваў для СССР, як гэта адбылося ў рэальнасці.

Часткова краіны Усходняй Еўропы насамрэч сталі такім своеасаблівым сацыяльным палігонам, і іх унутраны лад значна адрозніваўся ад СССР, нярэдка ў лепшы бок. Аднак у цэлым у сацыялістычным лагеры панавала атмасфера цэнтралізаванага аўтарытарызму, і Масква ў якасці «старэйшага брата» надзвычай насцярожана ставілася да любых сацыяльных эксперыментаў і праяў свабодамыснасці. Нягнуткасць і кансерватыўнасць савецкага кіраўніцтва справакавалі жорсткае падаўленне «Пражскай вясны», якая і была спробай такога сацыяльнага эксперыментатарства, абумоўленага імкненнем палепшыць, удасканаліць сацыялізм.

Расправа з «Пражскай вясной» стала шокам для чэхаславацкага грамадства, і менавіта адсюль бярэ пачатак той радыкальны празаходні антысавецкі рух, які прыходзіць да ўлады ў выніку «аксамітнай рэвалюцыі» ў 1989 годзе. Дарэчы, увасабленнем гэтага руху і стаў Вацлаў Гавел.

Хто ведае, паводзі сябе савецкае кіраўніцтва больш мудра ў далёкім 1968 годзе, магчыма, мы сёння і не згадвалі б Гавела як вялікага магільшчыка сацыялістычнай сістэмы...

**Усевалад ШЫМАЎ,**
**кандыдат палітычных навук,**
**дацэнт кафедры паліталогіі БДУ.**

КІРМАШ — штотыднёвы рэкламны выпуск № 51 (713) — аддзел рэкламы ☎ 287 17 79

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ПРАДАЕЦЦА**

❒ Касілка 2-ротарная новая, Польшча.
Тэл. 8 029 292 06 14.

❒ Кажух муж., натур., б/к, у добрым стане, п. 50—52, шапка муж., б/к, п. 58, пральная машына «Арыстон», б/к, танна.
Тэл.: 8 017 208 28 78, МТС 7921278.

❒ Станок дрэваапрацоўчы «УБДН-6М» (Разумнік) 220 в, 1,5 кВт, 60 кг, 8 аперацый, новы.
Тэл. 8 029 189 77 10.

❒ Дом у в. Браносава Карэліцкага раёна Гродзенскай вобл. з г/пабудовамі, 21 сотка, гараж, калодзеж, газ, сад.
Тэл. 8 01772 533 34.

❒ Лазня 320х350 драўляная, задні мост МТЗ-80, блокі аконныя драўляныя 90х120.
Тэл. МТС 8 029 734 05 44.

ЗВЯЗДА — КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_______ №_____________ Выдадзены ____________________

Подпіс ____________________ Дата __________

# ЦЭЛЫ СВЕТ ВАКОЛ ЦЯБЕ!

**Год кнігі**

**ДЫРЭКТАР Магілёўскай гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Галіна Краўчанка кажа, што Год кнігі пачынаецца добра, нават цудоўна. Таму што літаральна напрыканцы мінулага года магілёўскія бібліятэкі атрымалі 260 мільёнаў рублёў на падпіску і закуп новай літаратуры, у тым ліку і на беларускай мове.**



### Актуальныя Багдановіч і Быкаў

— Нашы самыя смелыя спадзяванні спраўдзіліся, таму 2012-ы не заспеў нас знянацку! Але справа тут не толькі ў новых кнігах, але і ў нас саміх. Сёлета будзе адзначацца 130-гадовы юбілей Купалы і Коласа, але што мы ведаем пра іх? Ну, на якой паліцы стаяць іх кніжкі — так, дакладна. Зразумела, чыталі ў школе і ў часы студэнцтва...

*— Вы вырашылі ўсім працоўным калектывам перачытваць беларускую класіку?*

— Хутчэй, аднавіць у памяці, каб правільна рэкамендаваць чытачам. Таму мы ўжо другі месяц наведваем спецыяльныя курсы: беларусазнаўца Кацярына Сазонава раз на тыдзень праводзіць з намі ўрокі роднай мовы і літаратуры. Яна чытае на памяць цэлыя паэмы, і мы імкнёмся да ведаў, крочым за сваім педагогам. Мы яшчэ не вельмі добра размаўляем па-беларуску, але настаўніца верыць у сваіх «вучаніц», і мы шчыруем. Так хочацца размаўляць прыгожа, як у вершах Купалы і Коласа, дзе ўсё лёгка, пявуча! Адна асалода.

Вось сапраўды, каб вывесці беларускую літаратуру на ўзровень чытання рознымі пакаленнямі, бібліятэкарам неабходна самім яе ведаць. Мы толькі што нанова адкрылі для сябе Багдановіча. А вось на маім стале кніга аповесцяў і апавяданняў Быкава — гэта маё хатняе заданне, дарэчы.

*— Я сама калісьці палюбіла беларускую мову дзякуючы творам Івана Шамякіна. Напэўна, беларускую класіку і цяпер чытаюць найбольш школьнікі і студэнты?*

— Памылковая думка. Паспрабуйце самі пачытаць. Для мяне Быкаў аказаўся вельмі павучальным: ён нібыта яшчэ раз нагадаў мне, што складаныя жыццёвыя абставіны «штурхаюць» людзей на такія ўчынкі, якія нібыта скіраваны на добрае, але часам атрымліваецца наадварот. Напрыклад, такое можа быць з мацярынскай любоўю. Перад чалавекам часам паўстаюць такія пытанні, за адказамі на якія хочацца звяртацца да мудрых класікаў, і варта гэта рабіць.

### У чарзе па Батракову

— Увогуле ў нас ёсць цэлае кола чытачоў, якія чытаюць толькі беларускую літаратуру, ад класікі да новых твораў, надрукаваных у часопісах. Некаторыя патрабуюць літаратуру толькі на роднай мове!

*— Аднак размова ідзе не толькі пра класіку, але і пра сучасных беларускіх аўтараў.*

— Людзі сярэдняга ўзросту і маладзейшыя аддаюць перавагу творам Наталлі Батраковай, Тамары Лісіцкай, Сяргея Клімковіча. Яны пішуць па-руску. У нас вялікі недахоп іх кніг. У кожнай бібліятэцы, напрыклад, усяго некалькі кніг Батраковай, і ў нас на іх існуе чарга! Летась Наталля пабывала па нашым запрашэнні ў Магілёве, адбылася цікавая сустрэча з чытачамі ў Ратушы. Пісьменніца паабяцала, што яе новая кніга з'явіцца ў лютым, і мы хвалюемся: а які будзе наклад, ці хопіць усім асобнікаў?

*— А ўвогуле ёсць цяжкасці з камплектаваннем бібліятэк кнігамі сучасных беларускіх пісьменнікаў?*

— Мы адчуваем іх недахоп. Я ўчора зайшла спецыяльна ў кніжную краму і не знайшла на беларускай паліцы папулярных сучасных аўтараў. Што датычыцца выдавецкіх прайсаў — калі са школьнай праграмай усё проста, то па іншыя кнігі даводзіцца пабегаць.

Акрамя твораў ужо названых аўтараў, чытачам падабаюцца дэтэктывы Віктара Праўдзіна, дзеці зачытваюцца Андрэем Жвалеўскім, моладзь аддае перавагу фантастыцы Сяргея Антонава, людзі замаўляюць гумарыстычныя творы Вольгі Грамыкі, гістарычныя кнігі Юрыя Татарынава.

Але мы не заўсёды можам задаволіць патрэбы наведвальнікаў. Таму вельмі хочацца, каб нашы буйныя беларускія выдавецтвы больш вялікімі накладамі друкавалі сучасных айчынных аўтараў, каб не шукаць іх кнігі ў маленькіх «канторах» Расіі. Гэта мы кажам ад імя вялікай арміі нашых чытачоў і ад нас саміх, бо нам хочацца прыцягнуць да чытання моладзь.

### Тут чакаюць пісьменнікаў

*— А якія пажаданні ёсць да пісьменнікаў?*

— Вельмі хочацца, каб беларускія пісьменнікі пісалі свае новыя кнігі на мясцовым матэрыяле. Мне так прыемна ў кніжках Батраковай і Лісіцкай пазнаваць мінскія вулачкі, якія для мяне дарагія. Пішыце нам творы пра жыццё нашых знакамітых землякоў, пра гістарычныя падзеі, якімі багата наша краіна. Не проста дакументальныя, а прыгодніцкія і дэтэктыўныя гісторыі.

Ды толькі ў нашым Магілёве такіх таямніц для напісання кніжак мільён: тут была Царская стаўка, адсюль зніклі беларускія каштоўнасці... І калі пацягнуць нітку з клубка і пераплесці з сучаснымі героямі, то па такія гісторыі тут бы чарга стаяла!

*— Карацей: пішыце пра нас і пра наш час! Ідэя актуальная: у Англіі новая хваля цікавасці да твораў Конан Дойла ўзнікла пасля поспеху тэлевізійнага серыяла «Шэрлак», дзе старыя дэтэктыўныя гісторыі перанесены ў наш час: Шэрлак Холмс ходзіць з сотавым тэлефонам, а доктар Ватсан вядзе інтэрнэт-блог.*

— Ведаеце, трэба ж зацікавіць моладзь, прыцягнуць яе да чытання! Пісьменнікам варта шчыраваць, каб заваяваць маладую аўдыторыю, а мы заўсёды гатовы рэкламаваць добрыя творы. Мы запрашаем беларускіх пісьменнікаў прыязджаць да нас, каб сустракацца з чытачамі, рабіць прэзентацыі сваіх кніг. Гэта вельмі добрая справа!

*— Летась, калі ў Магілёўскую вобласць прыязджала дэлегацыя пісьменнікаў, вельмі ўразілі сустрэчы з універсітэцкай моладдзю. Калі самі аўтары гаварылі, чыталі вершы, усё гэта знаходзіла вялікі водгук у студэнтаў, якія і слухалі ўважліва, і апладзіравалі гасцям.*

— Мы хочам арганізаваць шмат сустрэч з беларускімі пісьменнікамі ў Год кнігі. Звяртайцеся да нас і прыязджайце!

### Магілёў будзе чытаць

*— Што вы збіраецеся рабіць у сувязі з Годам кнігі ў бібліятэках Магілёва? Можа, гэта і скептычны погляд, але, напрыклад, мой сын-падлетак і яго сябры ніякага імпэту ў чытанні кніг не выяўляюць. Можа, кніга ўжо адмірае?*

— Не! Падаецца, кніга яшчэ пэўны час будзе жыць! Мы з вамі дакладна дажывём з кнігай у руках.

*— Асабіста я — ужо з электроннай кніжкай.*

— Ну так, можа, кніга і стане бібліяграфічнай рэдкасцю і людзі масава будуць пераходзіць на электронныя сродкі чытання. Але гэта таксама кніжка, толькі на іншым носьбіце. Праўда?

*— Так. «Качаць» актуальныя тэксты з інтэрнэту аказалася больш зручна і танна ў параўнанні з набыццём кніг у крамах.*

— Дык давайце чытаць. Мы хочам, каб кніга стала галоўнай дзеючай асобай 2012 года. Ва ўсякім разе, у нашым Магілёве, у Беларусі. Таму галоўны праект сёлета называецца: «Мы — за Магілёў, які чытае». Мы ўсё зробім, каб кніга была ў кожнай сям'і, у кожнага чалавека. Будуць літаратурныя марафоны, асветніцкія акцыі.

У межах іншага праекта «Ёсць такія імёны, ёсць такія даты» расказам пра знакамітых людзей, беларускіх пісьменнікаў. Будзем выкарыстоўваць усе свае інфармацыйныя магчымасці, нават на прадпрыемствах аформім стэнды. Сёлета нас чакае вялікая праца па папулярызацыі кнігі. Напрыклад, мы хочам папулярызаваць сямейнае чытанне.

*— Што вы маеце на ўвазе? Кніга ўсё ж такі рэч індывідуальная.*

— Памятаеце, калі ў XIX стагоддзі не было радыё і тэлебачання, людзі садзіліся і чыталі кнігі, разам і па чарзе, потым абмяркоўвалі. Гэта вельмі разумна: гісторыя, якая апісана ў кнізе, вас аб'ядноўвае. Выберыце нейкі твор, які будзе цікавы найперш сыну, а потым штовечар хаця б 10-15 хвілін чытайце па чарзе, услых. Гэта, вядома, нялёгка, трэба рабіць усё тактоўна і ненавязліва, але яно будзе каштаваць высілкаў, асабліва калі атрымаецца стаць бліжэй.

### Кніжкі ад суму і адзіноты

*— Сем'і цяпер разам найбольш глядзяць тэлевізійныя серыялы.*

— Гэта зусім не тое, што чытанне. Кніга «пройдзе» не толькі праз вашы вочы, але праз сэрца. І яшчэ адна парада: было б добра, калі б кніжка для сямейнага чытання была з гумарам. Трэба выхоўваць, развіваць у дзецях пачуццё гумару, бо яно дапамагае жыць. Пачуццё гумару — базавае для чалавека. Нельга ўсё навокал успрымаць надта сур'ёзна.

*— Усур'ёз цяжка ўявіць сабе, што чалавек можа сёння жыць без кнігі.*

— Ды гэта змрок! Нельга «падсесці» толькі на тэлебачанне і займацца кнопінгам з дапамогай дыстанцыйнага кіравання. Прыходзьце да нас! Людзі, якія сёння не ходзяць у бібліятэкі, страчваюць не толькі сябе, але і цэлы свет вакол. Дзе яшчэ можна атрымаць такую колькасць бясплатных кніг, часопісаў, газет — на любы густ? Прагрэс развіваецца імкліва (гэта наконт электронных кніжак і індывідуальнага чытання), але людзі апошнім часам усё часцей застаюцца адзінокімі. Таму бібліятэкі і кнігі — гэта вельмі актуальна ў нашым 2012 годзе.

**Ілона ІВАНОВА.**

# АЛЁ, НАРОД НА ПРАВАДЗЕ!

АБО ВЯСЁЛЫЯ І ПРАЎДЗІВЫЯ ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

## ПРЫНЦЫПОВЫ БРЫГАДЗІР

Пасля вайны Ігнат (а потым ужо і Пятровіч...) працаваў у калгасе — «старшым, куды пашлюць». Пасылалі яго ў розныя часы на розныя ўчасткі. У тым ліку — пасвіць калгасны статак. А гаспадарка ж бедная — пашы ніякай. Дык ён за дзень, бывала, так набегаецца — свет белы не мілы... Але ж стараўся чалавек. І працу не кідаў, нават пасля 60: зімой у мароз, завіруху вазіў сваім кароўкам корм, летам падымаўся да сонца, каб выгнаць іх у поле і па магчымасці добра напасвіць.

У той дзень, так атрымалася, яны рабілі гэта ўтрох. І Пятровіча, як самага «маладзейшага», тыя двое па віно паслалі. А ён і рады быў: схадзіў у краму, вяртаецца назад — брыгадзір пераймае. Пытаецца:

— Што нясеш?

— Нічога такога...

А кішэні ж адтапыраныя...

Брыгадзір ляп-ляп па іх — выцягвае дзве бутэлькі віна. І ў крык:

— А гэта што?! Піць... На рабоце... Са мной такі нумар не пройдзе! Я — чалавек прынцыповы!.. Звольню!

Пятровіч хацеў было паспрачацца, сказаць, што падстаў на гэта няма, бо ён жа не піў, мо нават не збіраўся, а толькі нёс... Але ж пярэчыць ён прывычкі не меў — змаўчаў.

А вось брыгадзір — не. Адразу ж панёсся ў кантору, напісаў «закладную» аб «распіцці» спіртнога ў працоўны час. Пятровічу «засвяцілі» разборкі, магчыма, нават звальненне. І 13-й зарплаты маглі пазбавіць.

Хто ведае, чым бы ўсё скончылася, каб не прыехаў у калгас нейкі людскі чалавек з райвыканкама, не пачуў пра канфлікт і не сказаў:

— Ды пабойцеся Бога! Чалавек столькі адпрацаваў... Не спраўляецца, хочаце звольніць, дык падзякуйце, уручыце які падарунак і адпраўце на пенсію.

Да голасу начальства — завядзёнка такая — у нас прыслухоўваюцца. Падарунка, праўда, Пятровічу не далі, але ж на працы пакінулі. І 13-ю выплацілі ў поўным аб'ёме. Атрымаў ён яе, задаволены выходзіць з канторы і ля ганка сустракае таго брыгадзіра. Кажа на радасцях:

— Пайшлі, браток, пачастую цябе каньяком.

Што цікава, той прынцыповы брыгадзір не адмовіўся: як нічога ніякага пайшоў за пастухом.

**Канстанцін КЛЕБАН,**
*г. Гродна.*

## «СІНОПТЫК»

У васьмідзясятых гадах мінулага стагоддзя сакратар райкама партыі кожную восень пытаўся ў мяне, якая будзе зіма. Толькі раз я спасаваў: маўляў, у красавіку адкажу. Ва ўсе ж астатнія гады беспамылкова адгадваў. Спытаеце, як мне гэта ўдавалася? Ды прадказальнік у гародзе рос.

Вось і сёлета ў жніўні жонка, помню, прыносіць у хату цыбуліну, кажа:

— Паглядзі — толькі дзве лупінкі на ёй. Значыць, зіма будзе цёплая. Перад халоднай і пяць, і восем «адзежын» на цыбулі бывае...

Сіноптыкі, ну вядома ж, робяць свае прагнозы па-іншаму, і сёлета недзе ў верасні газеты ўжо пісалі, што зіма чакаецца суровай...

У каго атрымаецца больш дакладны прагноз, пажывём — убачым.

**Алесь БЕЛАКОЗ,**
*п. Гудзевічы, Мастоўскі раён.*

## А НЕ ПІЛУЙ!

Гераіня майго аповеду (назавём яе Геня), можа, і ведала, што слова — серабро, а маўчанне — золата, але ў той дзень дакладна забылася.

...Было гэта ў сярэдзіне васьмідзясятых. Геня тая выйшла замуж, з мужыком за падораныя, пазычаныя і сабраныя грошы купілі яны «Жыгулі» — машыну па тым часе проста шыкоўную!

І вось у бліжэйшы выхадны выбраліся ў горад — што-кольвечы, можа, купіць, а галоўнае ж — паказацца, пафарсіць ім трэба было. У тым ліку перад раднёй...

Спачатку ля базару спыніліся. Геня пахадзіла там, але ж нічога не купіла (не было асабліва за што). А вось мужык яе нейкую «запцацку» ўзяў. І прывалок. Прывалок, па-першае, не папытаўшыся ў яе, па-другое, вельмі ж дарагую, па-трэцяе, на халеру яна, тая жалязяка — да новай машыны?! Карацей, жончынаму абурэнню межаў не было: усю дарогу, пакуль ехалі да радні, яна бэсціла свайго ёлупня.

Не спынілася, на жаль, і там. Сваякі ж пазайздросцілі іх пакупцы, сказалі, што яны малайцы — эканомныя... Раз маглі такое прыдбаць.

Словы гэтыя (ну пра эканомію) зноў нагадалі Гені пра мужаву пакупку, і яна яшчэ раз — ужо прылюдна — зганіла яго...

Муж прамаўчаў...

Дадому з тых гасцей яны выехалі ўпоцемках, думалі кожны пра сваё. Геня, у прыватнасці, пра тое, што мала «падваліла» свайму мужыку: так ён яшчэ штось можа купіць без дазволу... А таму, не адкладваючы на потым, яна «ўключыла» ранішнюю пласцінку: маўляў, дурны ён, не ўмее капейку берагчы, не ўмее і машыну вадзіць...

А тая... вазьмі і пачуй гэта — стала... Як укапаная! Муж давай заводзіць — не заводзіцца. Ён штось папраўляць (капот падняў) — марна.

І ніводнай душы вакол, ніводнай машыны, каб іх на буксір узяла. Што рабіць? Не кідаць жа новыя «Жыгулі» на дарозе»?

— Давай падпіхну, — вызвалася Геня.

А трэба сказаць, што маладзіцай яна вельмі спраўнай была: фізкультурны тэхнікум скончыла. Так што машына пад яе рукамі, а тым болей з горкі, як па масле кацілася. Пад гару, праўда, горай было... Геня змаглася, разоў колькі, бедная, садзілася ў кабіну, каб дух перавесці... Але ж вось на гарызонце іх вёска паказалася. І «Жыгуль» — яе «ўгледзеўшы» — раптам тах-тах-тах... Завёўся! Паехаў!

Дагнала яго Геня, ледзь жывая ўжо ўвалілася ў кабіну. Пытае ў мужа:

— Што ж з машынай было?

— Ды ўсё ў парадку, — той адказвае. — Папрокі твае дасталі, дык я табе іншы занятак падкінуў.

— Ах жа ж ты падлюка... — пачала было Геня і... асеклася, бо дадому ў вёску ёй, вядома ж, хацелася на машыне прыехаць, а не на сваіх дваіх прытупаць.

З тога разу — як сто баб яе адхадзіла: ніколі ні ў чым не папракала свайго мужыка. Асабліва ў дарозе.

**Іван КУРСЕВІЧ,**
*в. Суботнікі, Іўеўскі раён.*

## П'ЯНОМУ І Ў БУДЦЫ РАЙ

Неяк вяртаўся я дадому з лецішча. Каб не дужа здоўжылася, хацеў пачытаць, але ж побач дзве кабеты размову завялі. Хоць-нехаць давялося слухаць.

— Якую штуку мой выкінуў — сорам казаць, — гаварыла адна з жанчын. — Запрасілі, значыцца, нас у госці. Паблізу — праз чатыры дамы. Пайшлі мы ўтраіх: я, мая маці і Сцяпан. Пасядзелі там. Потым мой мне кажа: «Пайду дахаты. Нешта мяне на сон пацягнула». А як жа яно не пацягне, калі ён кілішак за кілішкам куляў?.. Але ж на нагах, паглядзела, як быццам трымаецца. «То ідзі, — кажу, — мы з мамай яшчэ пасядзім». Колькі там часу прайшло, я не глядзела, але ж вяртаемся дамоў, бачым — замок на дзвярах, няма Сцяпана! Абшукалі ўвесь падворак, пагледзелі ў лазні, у хляве — няма, прапаў чалавек! А на двары тым часам цямнець пачало... Вырашылі яго маршрутам прайсці: вуліцай, потым агародамі. Бачым на суседнім, каля новай сабачай будкі, нейкія чаравікі стаяць. Паглядзела — Божухна, дык гэта ж Сцяпанавы! Зазірнула ў будку — ён там: на саломцы храпе, сабаку абняўшы. Кажу: «Дык вось дзе ты месца знайшоў?!». І кіёчкам яго, кіёчкам. Усхапіўся. Будка вялікая, але ж галавою ляснуўся... Зразумець не можа, дзе гэта ён? І чаму я такая сярдзітая?.. Назаўтра толькі прызнаў, што яно разумней на тры чаркі меней узяць, чым на адну болей... І гэта ж шчасце яшчэ, што сабака трапіўся лагодны, стары, а каб злыдзень які, ды «цурбалак» адхапіў. Што тады?

Павучальная, між іншым, гісторыя.

**П.І. БРАТОК,**
*г. Мінск.*

## ПЛАТА ЗА ПРАЕЗД

Цэны дасталі. А хоць бы і за праезд: як быццам невялікія сумы, але ж калі пяць разоў на тыдзень на працу і назад, то яно набягае. А найгорш (гумарысты праўду кажуць): пакуль тыя грошы адлічыш — яно зноў падаражэла...

А пры камуністах жа іначай было, не напружвала плата за праезд: едзь — не хачу, хоць у Карпаты, хоць на Камчатку.

Але ж, як гэта ні дзіўна, ахвотныя заціснуць нейкую капейчыну былі і тады.

Зрэшты, па парадку.

Праезд з Рагачова да нашага Лучына ў тыя часы каштаваў 15 капеек, з Задруцця да нас (і адпаведна — назад) — увогуле дзесяць. З гэтай вёскай у нас адзін калгас тады быў, адзін сельсавет — з цэнтрам, ну вядома ж, у Лучыне! Вось людзі штодня і ездзілі па маршруце Жлобін — Рагачоў: ці мала ў каго якая патрэба?

То нейкая была і ў таго дзядка: з Задруцця ён выправіўся ў Лучын. Адзінае — дробных грошай не меў, каб заплаціць за праезд — падаў кіроўцу цэлую дваццацьпятку. Той рукамі развёў:

— Дзе ж я табе, дзеду, рэшты вазьму?.. А тым болей зранку... Едзь ужо так.

Стары, ну вядома ж, не супраць быў «так» праехаць. Больш за тое — яму «панаравілася».

Дзён праз колькі выправіўся ў дарогу зноў — зноў узяў дваццацьпятку, цяпер ужо сумысля. І што вы думаеце: яшчэ раз пракаціла — зэканоміў!..

Але ж не падумаў ён, што не адзін Гаўрыла ў Полацку. І не адзін ён гэтакі хітры: у кіроўцы ж таксама галава на плячах — не толькі для таго, каб шапку насіць. Запомніў ён старога, больш за тое — стаў сустрэчы чакаць.

І вось яна, тая ранічка: дзед на прыпынку стаіць са сваёй дваццацьпяткай, потым заходзіць у аўтобус — падае кіроўцу. А той, ліха ж на яго, бярэ! Ды яшчэ і кажа:

— Здымай, дзед, шапку: сёння ў мяне рэшта ёсць...

Пачынае сыпаць медзякі ды яшчэ і прыгаворвае:

— Можаш пералічыць: 24 рублі 90 капеек! Як лёду! Цяпер надоўга хопіць за праезд плаціць.

Стары ад такога «аблому» нават не знайшоўся што адказаць: так і стаяў ля кабіны, так і трымаў у руках сваю шапку. Але ж, калі выйшаў з аўтобуса, людзям сказаў:

— От, раскусіў ён мяне...

Прыйшлося чалавеку клыпаць у краму, здаваць там свой «залаты запас» — пераводзіць яго ў буйнейшыя грошы. А лучынскія ж прадавачкі за словам у кішэню не лезуць. Пытаюць:

— Ты што, дзед, няўжо на паперці недзе стаяў?

Няёмка старому...

Карацей — за дармавы праезд ён заплаціў спаўна, і пасля гэтага заўсёды меў пры сабе дробныя грошы.

**Соф'я КУСЯНКОВА,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

# БЯДА НА ЗІМОВАЙ ДАРОЗЕ



**Раніцай 3 студзеня ў Асіповіцкім раёне ў ДТЗ загінуў чалавек і сур'ёзна пацярпелі двое дзяцей.**

На аўтадарозе Барысаў—Бабруйск сутыкнуліся аўтамабіль «Сузукі Вітара» і мікрааўтобус «Фальксваген», які перавозіў групу дзяцей са Светлагорска ў санаторый «Свіслач» Асіповіцкага раёна. Мікрааўтобус пасля сутыкнення з'ехаў у кювет і ўдарыўся ў дрэва.

— Жыхары вёскі Асташковічы Светлагорскага раёна, 8-гадовая дзяўчынка і 12-гадовы хлопчык, у цяжкім стане былі дастаўлены ў бальніцу, — паведаміла інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Таццяна Старасотнікава. — Для 71-гадовага вадзіцеля «Сузукі» траўмы аказаліся не сумяшчальнымі з жыццём, і праз некалькі гадзін ён памёр у бальніцы. Следства цяпер устанаўлівае прычыны аварыі.

**Ілона ІВАНОВА. Фота Магілёўскай ДАІ.**

**РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 14 февраля 2012 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА**

| № лота | ЛОТ № 1 |
|---|---|
| Предмет аукциона | Право заключения договора аренды |
| Наименование арендодателя | РУП «Белоруснефть-Брестоблнефтепродукт» |
| Срок договора аренды | Три года |
| Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества | 1. Часть здания ТО АЗС-30 (инв. № 110/С-91244), арендуемой площадью 159,9 м$^2$, (инв. № 1043Б), расположенного по адресу: АЗС № 30, 0,5 км южнее д. Антоново, Барановичский р-н, Брестская область. |
| | 2. Часть благоустройства площадью 60 м$^2$ (инв. № 2729Б), расположенного по адресу: АЗС № 30, 0,5 км южнее д. Антоново, Барановичский р-н, Брестская область. |
| | 3. Резервуар 5 м$^3$ (инв. № 2113Б), расположенный по адресу: АЗС № 30, 0,5 км южнее д. Антоново, Барановичский р-н, Брестская область. |
| | 4. Вывески световые «Автосервис» в количестве 2 ед. (инв. №№ 5083Б, 5085Б), расположенные по адресу: АЗС № 30, 0,5 км южнее д. Антоново, Барановичский р-н, Брестская область. |
| | 5. Оборудование в количестве 7-и единиц: механизм для балансировки колес (инв. № 4214Б), шиномонтажный стенд (инв. № 4459), компрессор гаражный (инв. № 4742Б), тест-система СКО-1М (инв. № 4795Б), прибор проверки и регулировки света фар (инв. № 4800Б), передвижная установка для откачки масла 80 л (инв. № 4833.9Б), подъемник стационарный (инв. № 4743Б), расположенное по адресу: АЗС № 30, 0,5 км южнее д. Антоново, Барановичский р-н, Брестская область. |
| Цель использования | 1. Для ремонта и технического обслуживания автомобилей |
| | 2. Для парковки автомобилей |
| | 3. Для сбора отработанных масел |
| | 4-5. По прямому назначению |
| Начальная цена продажи, б.в. | 54,975 базовой величины |
| Сумма задатка, б.в. | 5,4975 базовой величины |
| Условия | 1. С победителем аукционных торгов в течение 5 раб. дней будет заключен договор аренды. 2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка. 3. Возместить организатору аукционных торгов в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола аукциона затраты на организацию и проведение торгов |
| Аукцион состоится 14 февраля 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 | |

**Для участия в аукционе необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 13 февраля 2012 г. до 17.00. Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**
* Оценка оборудования и транспортных средств
* Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
* Независимая строительная экспертиза

**Извещает о проведении аукциона по продаже оборудования ЧПУП «Гомельский завод Торгового оборудования»**

| № лота | Наименование объекта | Адрес объекта продажи | Начальная цена продажи, бел. руб. (без НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание склада площадью 473 кв.м,пристройка 63 кв.м, навес площадью 1168 кв.м, склад цемента площадью 64 кв.м, площадь земельного участка 0,2585 га | г. Гомель, ул. Текстильная, 10 | 599 900 000 | 29 995 000 |
| Срок подачи заявления | | До 17.00 17 января 2012 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2 | | |
| Дата, время, место проведения аукциона | | 18 января 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2, Гомельское областное управление Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация» | | |
| Номер р/с для перечисления задатка | | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 | | |
| Условие пользования | | Объекты продаются в собственность | | |
| Условия продажи | | Цены указаны без НДС. Шаг аукционных торгов – 5%. | | |

**Дополнительная информация по тел. (0232) 75 06 61, 75 06 63 (факс)**

## 10 студзеня

Дзве даты

**1558 год** — пачалася Лівонская (Інфлянцкая) вайна — вайна Маскоўскай дзяржавы з Лівонскім ордэнам, ВКЛ, Рэччу Паспалітай (з 1569 г.) і Швецыяй за тэрыторыю Лівоніі (Інфлянты, цяпер тэрыторыя Латвіі і Літвы). Пачалася па ініцыятыве цара Івана IV Грознага, які спадзяваўся праз Лівонію здабыць для свайй дзяржавы шырокі выхад да Балтыйскага мора. Завяршылася ў 1583 годзе паражэннем для Маскоўскай дзяржавы.



**49 год да н.э.** — са словамі «Жэрабя кінута!» Юлій Цэзар, адзін з трох кіраўнікоў Рымскай рэспублікі, перайшоў са сваімі легіёнамі раку Рубікон (Сенат забараніў яму пераходзіць мяжу паміж Галіяй і самой Італіяй, і Цэзар не быў упэўнены ў сіле свайго войска, таму вагаўся, бо ў выпадку няўдачы ён быў бы падвергнуты публічнай ганьбе). Пераход Рубікона — мяжы паміж Італіяй і Галіяй — азначаў, што Цэзар гатовы да рашучых дзеянняў. І прычына таго простая: пакуль Цэзар ваяваў у варварамі ў Галіі, а на іншай вайне загінуў Крас, Пампей у Рыме практычна прыбраў усю ўладу да сваіх рук. Так пачалася ў Рыме грамадзянская вайна, у якой Цэзар атрымаў перамогу над Пампеем і стаў поўнаўладным кіраўніком. Пасля пераходу Цэзарам праз Рубікон рака доўгі час была ва ўсіх на слыху, пакуль імператар Аўгуст не рэарганізаваў адміністрацыйнае дзяленне Італіі і не ўключыў у яе усе сучасны поўнач Італіі. У выніку Рубікон перастаў быць паўночнай мяжой Італіі. Пасля імклівага пашырэння рымскіх уладанняў слова «Рубікон» паступова знікала з тапаграфічнай карты. Таму доўгі час у Італіі спрабавалі высвятліць, якая ж з рэк на схілах Апенін і ёсць Рубікон, і ў 1932 годзе вырашылі сцвіліцца на рацэ Ф'юмічына, якая зараз і носіць гордую назву Рубікон. У пераносным сэнсе «Перайсці Рубікон» зараз азначае: здзейсніць учынак, які ўжо не можа быць адменены, прыняць небяспечнае і беззваротнае рашэнне.

Цытата дня:

*«Час — самы каштоўны падарунак, дадзены нам для таго, каб стаць у ім лепшымі, разумнейшымі, дасканалымі».*
**Томас Ман (1875—1955), нямецкі пісьменнік.**

## Усміхнемся

— Чаму вы запраўляеце салату «Аліўе» дзіцячым крэмам?
— У гасцей ад маянэзу твар шчыпле.

☺

**Самага вялікага шчупака вагой у 50 кілаграмаў злавіў рыбалоў са Шучына. Гэта на 7 кілаграмаў больш, чым наманіў папярэдні рэкардсмен.**

☺

— А ты куды рэшту пакладзеш?
— Вой, ведаеш, я толькі сумачку зайшла купіць, а тут да яе такая прыгожая блузка трапілася, што прыйшлося купляць боты для стварэння цэласнага вобраза!
— Зноў цэлы месяц на пельменях жыць...

☺

**Кошт найноўшага амерыканскага знішчальніка, нашпігаванага сучаснай электронікай, ужо амаль дасягнуў кошту кладкі кіламетра асфальту ў Маскве!**

☺

— Тата, я замуж выйшла!
— Нічога не ведаю, як сцямнее — дадому!

☺

**Толькі наш чалавек на пытанне «Ты куды?» адказвае: «Зараз прыйду».**




### АДКАЗЫ на сканворд + судоку

**Па гарызанталі:** Плашч. Валапас. Аўто. Эльф. Лат. «Лада». Апад. Жолуд. Кюі. Маснэ. Акт. Марак. Аплік. Тэта. Боб. Араб. Адат. Рэха. Рука. Варатар. Візітка. Яхтсмен. **Па вертыкалі:** Колба. Вілія. Лаўка. Дзікабраз. Школа. Малахіт. Мэта. Акіра. Пастка. Варган. Альфа. Бра. Джэм. Атара. Рэдут. «Атака». Сцюард. Катар. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | 1 | 5 | 6 | 7 | 3 | 9 | 4 | 8 |
| 8 | 6 | 9 | 4 | 5 | 1 | 2 | 3 | 7 |
| 4 | 3 | 7 | 2 | 9 | 8 | 5 | 1 | 6 |
| 1 | 5 | 3 | 9 | 4 | 7 | 8 | 6 | 2 |
| 9 | 4 | 8 | 3 | 2 | 6 | 7 | 5 | 1 |
| 7 | 2 | 6 | 1 | 8 | 5 | 4 | 9 | 3 |
| 5 | 8 | 1 | 7 | 6 | 4 | 3 | 2 | 9 |
| 3 | 7 | 2 | 5 | 1 | 9 | 6 | 8 | 4 |
| 6 | 9 | 4 | 8 | 3 | 2 | 1 | 7 | 5 |

## СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.

Сузор'е паўночнага паўшар'я. Воданепраніцальная вопратка. Невялікі гандлёвы пункт. Агульнаадукацыйная навучальная ўстанова. Тое, да чаго імкнуцца. «Галоўная» зорка ў сузор'і. Афіцыянт на пасажырскім судне, самалёце. Казачная істота, дух прыроды. Грузапасажырская машына (разм.). Грашовая адзінка ў Латвіі. Прылада для лоўлі звяроў. Варэнне — густое жэле. Плады, стрэсеныя ветрам. Лабараторны посуд. Экспартны варыянт «Жыгулёў». Грызун з іголкамі на спіне і баках. Ярказялёны мінерал. Японскі рэжысёр *** Курасава. Плод дуба. Вялікі гурт авечак. Абарончае збудаванне (даўнен). Статуя А. К. Глебава. Вострая распіраторная хвароба. Аўтар оперы «Манон». Кампазітар, сучаснік П.І.Чайкоўскага. Частка тэатральнай п'есы. Службовец на флоце. Кручок для зашпільвання вопраткі. Насценная лямпа. Літара грэчаскага алфавіту. Насельнік Паўночнай Афрыкі. У мусульман: звычайнае права. Агародная расліна. Язычковы музычны інструмент. Верхняя канечнасць чалавека. Правы прыток Нёмана. Мужчынская ручная сумачка. Водгулле, водгук. У футболе, хакеі — галкіпер.





Спартсмен на парусной лодцы

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | | | | | 9 | | 8 |
| | | 9 | | | | 2 | | |
| 4 | | 7 | | | | | 1 | |
| 1 | | 3 | 9 | | | 8 | 6 | |
| | 4 | | 3 | | 6 | | | |
| | | | 1 | 8 | | | | |
| | | | | 6 | 4 | | | |
| | | | 5 | | 9 | | 8 | |
| | 9 | 4 | | | 2 | 1 | | 5 |

**СУДОКУ.** У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клеткі, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

## СЁННЯ

**Месяц**
*Поўня 9 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 9.25 | 17.10 | 7.45 |
| Віцебск | 9.21 | 16.52 | 7.31 |
| Магілёў | 9.15 | 16.59 | 7.44 |
| Гомель | 9.03 | 17.04 | 8.01 |
| Гродна | 9.39 | 17.26 | 7.47 |
| Брэст | 9.31 | 17.35 | 8.04 |

**Імяніны**
*Пр. Агафіі, Зіновіі, Ігната, Ніканора, Пятра, Яфіма.*
*К. Агды, Дануты, Адрыяна, Вільгельма, Рыгора, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### НАДВОР'Е на заўтра




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +2..+4°C | КІЕЎ -1..+1°C | РЫГА +1..+3°C |
| ВІЛЬНЮС -1..+1°C | МАСКВА -5..-3°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ -2..0°C |

Геральдыка

# У НАШЫХ ГЕРБАХ — ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

## Марына ЕЛІНСКАЯ: «НАДАЛЕЙ ПРАЦА ГЕРАЛЬДЫСТАЎ БУДЗЕ СКІРАВАНАЯ НАЙПЕРШ НА СТВАРЭННЕ ВЕДАМАСНАЙ І ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЙ СІМВОЛІКІ — ДЛЯ ВЁСАК І ПАСЁЛКАЎ КРАІНЫ»

**МІНУЛЫ год быў асабліва адметным для Геральдычнай рады пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Напрыклад, у Мінскай вобласці фактычна завершана праца па стварэнні тэрытарыяльнай сімволікі: указам кіраўніка дзяржавы ў пачатку снежня заснаваныя сцягі тых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, якія іх не мелі. Яшчэ раней — адпаведна ў лютым і сакавіку — такімі ж указамі былі заснаваныя афіцыяльныя геральдычныя сімвалы адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Віцебскай і Брэсцкай абласцей. На пасяджэнні дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь быў разгледжаны і прыняты ў першым чытанні праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб афіцыйных геральдычных сімвалах». Ён скіраваны на правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі ў галіне стварэння, заснавання, рэгістрацыі і выкарыстання дзяржаўных сімвалаў. У нашай краіне такая праца — распрацоўка агульнадзяржаўнага закона аб геральдыцы — зроблена ўпершыню на постсавецкай прасторы. Пра гэта і іншае наша сённяшняя размова з даўнім сябрам «Звязды», галоўным спецыялістам дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі, сакратаром Геральдычнай рады пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь кандыдатам гістарычных навук Марынай ЕЛІНСКАЙ.**



***— Калі не супраць, пачнём з гербаў і сцягаў адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак. Стваральнікамі многіх гэтых афіцыйных геральдычных сімвалаў — разам з мастаком Віктарам Ляхарам — з'яўляецеся вы. Коратка раскажыце пра некаторыя з іх...***

— Калі ўзяць апошні па часе ўказ — па Мінскай вобласці — ім былі заснаваныя сцягі тых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, якія іх не мелі. Гаворка пра 9 сцягоў: Валожына, Клецка, Крупак, Капыля, Любані, Салігорска, Старых Дарог, Узды, Чэрвеня — з раёнамі ва ўсіх выпадках. Сцяг па традыцыі з'яўляецца трансфармацыяй герба з выкарыстаннем яго асноўных колераў, уяўляе сабой палотнішча з суадносінамі бакоў 1:2. Калі сказаць некалькі слоў пра самі гербы названых гарадоў, дык у Клецка, Капыля і Чэрвеня яны гістарычныя (у першых двух населеных пунктаў — перыяду Вялікага Княства Літоўскага, у трэцяга — перыяду Расійскай імперыі), у Валожына, Крупак, Любані, Салігорска, Старых Дарог, Узды — новастворaныя за апошнія дзесяць гадоў.



Сцяг горада Чэрвеня і Чэрвеньскага раёна.

У Віцебскай вобласці ў канцы зімы былі заснаваны афіцыйныя геральдычныя сімвалы наступных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак: гербы і сцягі Віцебскага раёна, гарадскіх пасёлкаў Бягомль Докшыцкага раёна, Балбасава Аршанскага, Лынтупы Пастаўскага, Арэхаўск Аршанскага раёна; сцягі горада Верхнядзвінск і Верхнядзвінскага раёна, горада Гарадок і раёна, горада Докшыцы і раёна, горада Талачын і раёна, гарадскога пасёлка Ушачы і Ушацкага раёна, горада Дуброўна.

Напрыклад, у працы пры стварэнні новых герба і сцяга гарадскога пасёлка Лынтупы Пастаўскага раёна геральдысты кіраваліся «архітэктурным» прынцыпам, пры якім выкарыстоўваецца якое-небудзь гістарычнае збудаванне населенага пункта (крапасная сцяна, храм, будынак, вежа і інш.), што існуюць у ім. З ім звязаны значныя падзеі мінулага, яно ўяўляе мясцовую гістарычную адметнасць, з'яўляецца знакавым для месцічаў. У пісьмовых крыніцах Лынтупы згадваюцца ў 1385 годзе, а з 1459 года яны вядомыя як прыватнае ўладанне віленскага ваяводы Даўгірдовіча. Дзякуючы яго дапамозе і падтрымцы тут быў пабудаваны драўляны касцёл святога Андрэя, які пазней неаднаразова перабудоўвалі. У XVI стагоддзі Лынтупы ўваходзілі ў Ашмянскі павет Віленскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага, знаходзячыся ва ўласнасці Астроўскіх, Гільзенаў, Бучынскіх. З 1854 па 1939 год яны належалі Бішэўскім. У 1907 годзе ў сяле пабудавалі вежу-вяндлярню, якая захавалася да нашых дзён у тым выглядзе, у якім яна прадстаўлена ў геральдычных сімвалах. Акрамя сядзібы, якая часткова захавалася, і Андрэеўскага касцёла, вежа з'яўляецца помнікам архітэктуры пачатку XX стагоддзя. Яе дапаўняе геральдычнае адлюстраванне ракі Лынтупкі, на беразе якой яна стаіць.

Герб гарадскога пасёлка Лынтупы Пастаўскага раёна.



Увесну ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь былі заснаваны афіцыйныя геральдычныя сімвалы — гербы і сцягі Пінскага раёна, горада Іванава, вёсак Варацэвічы і Моладава Іванаўскага раёна, вёскі Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна. Спынімся толькі на адным прыкладзе.

Форма варажскага шчыта, характэрная для сучаснай геральдыкі Брэсцкай вобласці, не стала выключэннем і для герба горада Іванава. У яго блакітным полі адлюстраваны сярэбраны храм, размешчаны паміж рагамі залатой падковы. Выбар гербавага сюжэта звязаны з заняткам у мінулым карэнных жыхароў, якія вялі збор ахвяраванняў на будаўніцтва і аднаўленне храмаў, у асноўным праваслаўных, паколькі месцічы — лабары — былі праваслаўнымі хрысціянамі. Настаяцелі многіх цэркваў карысталіся іх паслугамі, і пры гэтым лабары не ўпускалі магчымасці зарабіць сваім рамяством і для рымска-каталіцкай царквы. Сваім заняткам яны займаліся на абсягах ад Чорнага да Балтыйскага мораў, ад Польшчы да Расіі. Перасоўваліся пераважна конна, таму менавіта падкова сімвалізуе дарогу, рух, удачу. Паміж яе рагоў пасаджаны, як прынята гаварыць у геральдыцы, сярэбраны храм, які мае рэальны прататып. Зараз на гарадской плошчы месціцца царква Пакрова Святой Багародзіцы, якая з'яўляецца сімвалічным цэнтрам горада. Таму яе галоўны фасад і адлюстраваны на гербе.

Герб горада Іванава Брэсцкай вобласці.



***— З падпісаннем сёлета кіраўніком дзяржавы адразу трох указаў аб заснаванні афіцыйных геральдычных сімвалаў гэтая праца ўсё роўна ж не завершана...***

— Сёння ў краіне афіцыйна заснаваныя гербы і сцягі ўсіх абласцей і абласных цэнтраў. Напрыклад, у Магілёўскай вобласці завершаны комплекс мерапрыемстваў па стварэнні тэрытарыяльнай сімволікі, іншымі словамі, тут заснаваныя гербы і сцягі ўсіх раённых цэнтраў. У Гомельскай вобласці ў асноўным усе гербы былі заснаваныя яшчэ да стварэння Геральдычнай рады, але ў некаторых гарадах няма сваіх — афіцыйна заснаваных — сцягоў. І ініцыятывы з месцаў аб пачатку такой працы, на жаль, няма... У Брэсцкай вобласці — найбольшая колькасць зарэгістраваных у Дзяржаўным геральдычным рэгістры гербаў. З іншага боку, па ініцыятыве жыхароў асобных населеных пунктаў вобласці, якія пажадалі мець уласныя новыя афіцыйныя геральдычныя сімвалы, праца будзе ў далейшым працягвацца менавіта ў гэтым кірунку. Таму больш правільна гаварыць, што ў перспектыве будзе весціся праца не па стварэнні афіцыйных геральдычных сімвалаў адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак, а найперш — тэрытарыяльных адзінак: вёсак, гарадскіх пасёлкаў. Дарэчы, хачу заўважыць пра Баранавіцкі раён... Сёння ён адзіны ў краіне, які не мае афіцыйна заснаваных геральдычных сімвалаў і такіх спробаў — даслаць на разгляд паперы ў нашу Геральдычную раду — ні разу не было. Мне трохі прыкра і балюча ад гэтага, таму што Баранавічы — мой родны горад, я там нарадзілася і пражыла першыя гады жыцця...

У Гродзенскай вобласці ёсць шэраг гістарычных гербаў розных перыядаў, якія таксама не прайшлі працэдуру афіцыйнага заснавання і ўнясення ў Дзяржаўны геральдычны рэгістр. Найперш на слыху Жыровічы, Крэва, далей можна назваць, напрыклад, Волпу, Прывалкі... Як на мой погляд, дык гістарычныя гербы гэтых населеных пунктаў — цалкам заслужаных, так бы мовіць, — ніяк не выкарыстоўваюцца мясцовымі ўладамі...

***— А колькі ўсяго зараз зарэгістравана ў краіне адзінак відаў сімволікі?***

— У Дзяржаўны геральдычны рэгістр унесена 1 358 усіх такіх адзінак захавання розных відаў сімволікі. У прыватнасці, гэта гербы і сцягі 197 адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак: абласцей, раёнаў, гарадоў, гарадскіх пасёлкаў і вёсак. Па абласцях лічбы такія: па Брэсцкай — 43, па Віцебскай — 42, па Гомельскай — 32, па Гродзенскай — 28, па Мінскай — 30, па Магілёўскай — 22. Нагадаю, у большасці з іх маецца поўнае геральдычнае забеспячэнне — герб і сцяг. 150 найменняў у рэгістры — гэта эмблемы, сцягі, нагрудныя знакі дзяржаўных органаў і арганізацый, зацверджаныя ўказамі кіраўніка дзяржавы. Астатняя колькасць — знакі, эмблемы, штандарты дзяржаўных органаў, устаноў, арганізацый, якія яны заснавалі самастойна.

Варта нагадаць, што афіцыйныя геральдычныя сімвалы займаюць асаблівае месца ў любой дзяржаве. Яны з'яўляюцца спецыфічным адлюстраваннем дзяржаўнай ідэалогіі і нацыянальнай культуры, падкрэсліваюць міжнародны статус краіны. Гэта і палітычны, і сацыяльна-культурны капітал і дзяржавы, і нацыі.

***— Вяртаючыся да ўпершыню распрацаванага на постсавецкай прасторы закона аб геральдыцы — у чым яго адметнасць? Як вялася праца?***

— Праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб афіцыйных геральдычных сімвалах» быў прыняты ў першым чытанні. Над ім працавалі па-сапраўднаму прафесійныя геральдысты. Галоўная яго адметнасць у тым, што ўся нарматыўная база ў гэтай сферы была абагульненая на агульнадзяржаўным узроўні. У ім цалкам прапісаны алгарытм стварэння таго ці іншага геральдычнага сімвала — ад ідэі, экспертызы ў Геральдычнай радзе, да афіцыйнага заснавання, унясення ў рэгістр, выдачы пасведчання і практычнага яго выкарыстання. Паколькі, умоўна кажучы, гербы і сцягі — гэта адно, нагрудныя знакі сілавых структур — другое; у кожнага з іх свае функцыі і прызначэнне. Такая праца сапраўды была зробленая ўпершыню на постсавецкай прасторы, паколькі дагэтуль у той жа Расіі падобныя законы існавалі на рэгіянальным узроўні. Закон аб афіцыйнай сімволіцы ёсць, скажам, у Варонежскай вобласці, асобна — у Маскве і Маскоўскай вобласці.

***— А чаму згадваецца толькі постсавецкая прастора? А вопыт Чэхіі, Германіі, Вялікабрытаніі...***

— Калі гаварыць пра Вялікабрытанію, там меркаванне каралеўскай геральдыі традыцыйна ўспрымаецца як няпісаны закон. Яно мае статус бясспрэчнага. Наадварот, нямецкія геральдысты працуюць у сваіх землях без адарванасці ад жыхароў гарадоў, мясцовых уладаў, а ў шчыльным супрацоўніцтве, калі ўсе магчымыя спрэчкі скіроўваюцца спецыялістамі ў патрэбным рэчышчы, якое адпавядае няпісаным законам геральдычнай навукі.

***— А пасля ўступлення ў сілу закона аб геральдыцы ў чым будзе заключацца адзіная дзяржаўная палітыка ў гэтай галіне?***

— У адпаведнасці з дакументам, каардынацыю дзейнасці па правядзенні такой адзінай дзяржпалітыкі ў сферы геральдыкі будзе весці Геральдычная рада пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, якая праводзіць геральдычную экспертызу сімволікі. У законе прадугледжаны нават тэрміналагічны слоўнік, які змяшчае дакладнае абазначэнне тэрмінаў кожнага віду афіцыйнага геральдычнага сімвала, абазначаны парадак праходжання працэдур для стварэння, заснавання, рэгістрацыі і выкарыстання афіцыйных геральдычных сімвалаў.

***— Цяпер, відавочна, стане немагчымым з'яўленне сімволікі з недарэчнымі, занадта прамалінейнымі атрыбутамі — якой яна часам бачыцца, прабачце, дылетантам ад геральдыкі на месцах?..***

— Гербы, сцягі адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак, эмблемы і нагрудныя знакі спецыяльных фондаў Прэзідэнта краіны, сцягі, эмблемы, штандарты, нагрудныя і апазнавальныя знакі органаў, форменнае адзенне вайскоўцаў і супрацоўнікаў дзяржорганаў зацвярджаюцца Прэзідэнтам Беларусі. Сімволіка структурных падраздзяленняў дзяржорганаў і арганізацый, а таксама палітычных партый, прафесійных саюзаў зацвярджаецца гэтымі дзяржарганізацыямі, аб'яднаннямі і партыямі.

У цэлым можна гаварыць пра тое, што асноўнымі прынцыпамі стварэння, заснавання, дзяржрэгістрацыі і выкарыстання афіцыйных геральдычных сімвалаў з'яўляецца законнасць і захаванне агульнадзяржаўных інтарэсаў, гістарычных, нацыянальных, сацыяльных, культурных, прафесійных і іншых традыцый, а таксама іх ахова дзяржавай.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

## КАБАЧКОВАЯ ІКРА Ў КАШЭРНЫМ ВАРЫЯНЦЕ

**КАШЭРНЫЯ кансервы пачалі вырабляць на ААТ «Быхаўскі кансервава-гароднінасушыльны завод».**

Ікру з кабачкоў і гарбузоў, фасолю, розныя кетчупы і варэнне з журавін адпраўляе прадпрыемства з горада Быхава ў Расійскую Федэрацыю, прычым вялікімі партыямі ў сотні тысяч слоікаў. Усе гэтыя кансервы маюць знак «Кашэр Расіі» і выпрацоўваюцца пад наглядам рабіна ў адпаведнасці з патрабаваннямі кашрута і зборам яўрэйскіх законаў аб ужыванні прадуктаў. Рабін, які прыязджае з Магілёва, перад пачаткам вытворчасці праводзіць рытуал: моліцца, распальвае ў кацельні агонь.

Нядаўна на прадпрыемстве пабывала інспекцыя з Ізраіля: у Быхаве разлічваюць наладзіць пастаўкі і на рынкі далёкага замежжа. У Ізраілі і ЗША ёсць вялікія магчымасці для збыту кашэрнай ежы.

Прычым бліжэйшым часам кансервавы завод павялічыць асартымент кашэрнай прадукцыі — гэта будуць джэмы і сокі. Аднак на паліцах беларускіх крам пакуль ёсць толькі звычайная, а не кашэрная прадукцыя Быхаўскага кансервава-гароднінасушыльнага завода.

**Ілона ІВАНОВА.**

## І давёў прадпрыемства да банкруцтва

**ПАВОДЛЕ інфармацыі Віцебскай абласной інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах, таварыствам з дадатковай адказнасцю, якое ажыццяўляе дзейнасць у Віцебскай вобласці, былі аформлены здзелкі з ілжэпрадпрымальніцкімі структурамі. І ў выніку такіх незаконных аперацый прадпрыемствам у значным аб'ёме была заніжана выручка, фактычна атрыманая ад рэалізацыі тавараў.**

Дырэктар прадпрыемства сваімі дзеяннямі нанёс шкоду дзяржаве і прывёў прадпрыемства да банкруцтва. За гэта ён быў прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. Прыгаворам суда з дырэктара таксама спагналі 3,5 мільярда рублёў за нанесеную шкоду. Акрамя таго, рашэннем гаспадарчага суда Віцебскай вобласці на вінаватага была ўскладзена матэрыяльная адказнасць у памеры 2,1 мільярда рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 119. Нумар падпісаны ў 19.30 9 студзеня 2012 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12